СТАРТУЮЦЬ ВОСЕНЬСКІЯ КІРМАШЫ 9

САМАІЗАЛЯЦЫЯ: ХТО АБАВЯЗАНЫ ВЫКОНВАЦЬ РЭЖЫМ? 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 ВЕРАСНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 171 (29540)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:

«З красавіка гэтага года мы прапануем Еўрапейскаму саюзу правесці кансультацыі па пытаннях нелегальнай міграцыі. ЕС катэгарычна адмаўляецца. Краіны ЕС у міграцыйным пытанні адмаўляюцца выконваць свае міжнародныя абавязацельствы. Мы гэта ўсё бачым і, натуральна, будзем гаварыць пра гэта на ўсіх міжнародных пляцоўках. Мы гатовыя да дыялогу. Лічым, што толькі ў рамках спакойнага, узаемапавазлівага абмену думкамі, без вылучэння штучных прэтэнзій, пагроз і шантажу можна знайсці рашэнне любога пытання, у тым ліку звязанага з цяперашняй сітуацыяй на граніцы».

ЯДНАННЕ СЛОВАМ

Як прайшло свята ў Капылі

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На старонках «Звязды» мы ўважліва сачылі за тым, як рыхтуюцца да XXVIII Дня беларускага пісьменства ў Капылі. Дзякуючы святу, горад сапраўды аднавіўся: адрамантавалі школы, усталявалі памятны знак паэту-земляку Цішку Гартнаму, а будынак пошты нават упрыгожылі мурапам. Тэмай сёлетняга фестывалю паслужыў Год народнага адзінства, таму агульны слоган гучаў наступным чынам: «Слова нас аб'ядноўвае». Падчас прэс-канферэнцый, прымеркаваных да Дня пісьменства, арганізатары абяцалі шмат цікавостак. Як жа прайшло свята? Аб тым, якія адмысловыя аб'екты адкрыліся, як мы частаваліся травяной гарбатай і знаёміліся з чалавекам у шкляным касцюме, чытайце ў гэтым рэпартажы.

СТАР. 4

Фота БелТА.



КАРОТКА

- Гарбуз з Гомельскага раёна заняў другое месца на ўсерасійскім аграбатле.
- **Спілс-карты, «пункты свету» і новае пакаленне: у Гомелі маладзёжны саюз адзначыў 19-годдзе.**
- Ізраіль з 19 верасня дазволіць уезд для невялікіх груп турыстаў.
- **Электронны кірмаш вакансій для маладых жыхароў Мінска пройдзе 9 верасня.**
- Стартаваў фінальны этап «Скуранога мяча».
- **У Беларусі з 7 верасня павышаюцца цэны на аўтамабільнае паліва.**
- Лета 2021 года было адным з самых гарачых за ўсю гісторыю метэаназіранняў у Беларусі.
- **«Беларуснафта» да канца года павялічыць да 600 адзінак колькасць запраўак для электратранспарту.**

Смачна і карысна

«ШКОЛЬНЫ» ШАШЛЫЧОК, ФІЛЕ ПТУШКІ З АНАНАСАМ І «РАЗУМНЫЯ БУФЕТЫ»

Як улічваюцца новыя тэндэнцыі ў харчаванні вучняў?

Адной з асноўных прычын, чаму старшакласнікі адмаўляюцца харчавацца ў школьнай сталовай, з'яўляецца знешні выгляд работнікаў кухні. Гэта паказала праведзенае некалькі гадоў таму анкетаванне сярод школьнікаў.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Гэта вырашэнне праблем краіны — мы забудзем аб усякай залежнасці»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву і генеральнага дырэктара «Беларуснафты» Аляксандра Ляхава.

Прэзідэнт адзначыў, што ўважліва назірае за дзейнасцю «Беларуснафты», але даўно на асабістай сустрэчы з кіраўніком кампаніі не абмяркоўвалі праблематыку галіны, якая з'яўляецца найважнейшай для краіны.

«Вялікіх прэтэнзій няма, акрамя адной — неабходна кожны год дадаваць», — сказаў кіраўнік краіны, ацэньваючы дзейнасць кампаніі. Ён пахваліў за работу на тэрыторыі Расіі: ад рамонту свідравін «Беларуснафта» перайшла да здабычы «чорнага золата». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што перад сустрэчай з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным яго вельмі цікавіць, як ідуць там справы і якія прапановы ёсць па развіцці супрацоўніцтва ў гендырэктара.

Кіраўнік краіны заявіў, што, калі кампаніі патрабуецца падтрымка ў рабоце ў Расійскай Федэрацыі, ён гатовы падключыцца да вырашэння пытанняў.

Прэзідэнт згадаў гісторыю развіцця нафтапрамысловасці ў Беларусі, якая адбіваецца і на сённяшнім становішчы галіны: «Пасля адкрыцця перспектыўных радовішчаў нафты ў Беларусі, яшчэ да нас з вамі, там здабывалі звыш 8 мільёнаў тон нафты. Мы выкачалі сваю нафту, бо памылкова лічылі, што ў нас мора нафты. Магчыма, у нас і ёсць нейкае мора, якое мы з вамі пакуль не знайшлі. І гэта галоўная тэма сённяшняй нашай размовы. Але калі б нам зараз 8-9 мільёнаў тон нафты (у год. — **«Зв.»**), мы б жылі лепей, чым самыя багатыя краіны нашай планеты. Але такога, на жаль, няма».

Кіраўнік дзяржавы папрасіў расказаць аб праблемах у дзейнасці кампаніі, адзначыўшы, што ведае пра асноўныя з іх.

«Залішне ў нас бюракратыя развялася, валакіты дастаткова, але мы гэта вырашым. Вырашым так, як калісьці па заправачных станцыях. Калі «Беларуснафта» дзесьці ў краіне не ў стане пабудаваць заправачную станцыю, калі ласка, візіруйце дакумент, я падпішу — аддадзім іншай кампаніі. 70 працэнтаў рынку вы сёння забяспечваеце ў Беларусі. Я гэта буду падтрымліваць заўсёды, пакуль я Прэзідэнт», — паабяцаў кіраўнік краіны, нагадаўшы, як «Беларуснафта» аднойчы фактычна выратавала краіну, калі Расія спыніла пастаўкі «чорнага золата» на наш рынак. Тады, па яго словах, пэўныя колы спадзяваліся, што ў Беларусі ўзнікне дэфіцыт нафтапрадуктаў. Але ўсю нафту, якую здабывалі ў краіне, павярнулі на пераапрацоўку для свайго рынку. «І людзі не заўважылі, і дэфіцыту не было дзякуючы нашай кампаніі. У свой час мной было прынятае правільнае рашэнне: я забараніў усякую прыватызацыю «Беларуснафты». Гэта дзяржпрадпрыемства, якое павінна забяспечыць наша насельніцтва неабходнымі нафтапрадуктамі. Без нафтапрадуктаў Беларусі сёння няма», — дадаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што яго таксама вельмі цікавіць праблема Прыпяцкай упадзіны («Беларуснафта» мае планы па асваенні нетраў Прыпяцкага Палесся. — **«Зв.»**).

«Нутром адчуваю, што там у нас нафта ёсць, якую мы яшчэ не бачым. Калі вы вывучалі гэту праблему, калі вы нешта прапануеце, я гатовы ў гэтым непасрэдна ўдзельнічаць, каб мы нарасцілі здабычу нафты пры нашым з вамі жыцці да 3—3,5 мільёна тон (у год. — **«Зв.»**). Гэта вырашэнне праблем краіны — мы забудзем аб усякай залежнасці. А калі і атамную станцыю яшчэ адну пабудуем, дык краіна будзе забяспечана ўсім неабходным, асабліва энергіяй», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Перспектывы не толькі за паліўнымі рэсурсамі, але і за электрамабілямі. Таму Прэзідэнт падзякаваў Аляксандру Ляхаву за прасоўванне электразаправак.

«Пытанне сур'ёзнае, але сёння мы здымем усякую валакіту, бюракратызм. Вы не саромейцеся пра гэта казаць шчыра. Вы ж яшчэ і сенатар. Калі вам неабходна падтрымка, як у нас любяць казаць «дах», дык вось ён «дах»! Старшыня Савета Рэспублікі заўсёды вас падтрымае. Калі трэба, любы дакумент мне напрамую даложыць і ва ўрадзе прасуне нейкую ідэю. Мы не можам загубіць тэндэнцыю да электрамабіляў. А для электрамабіляў неабходныя запраўкі», — заявіў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, такія станцыі могуць стварацца ў Віцебску, і гэту работу неабходна разгортваць хутка і якасна.

Яшчэ адна тэма, якую Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з гендырэктарам «Беларуснафты», — добрае ўпарадкаванне раённых цэнтраў.

«Наша краіна славянская, сялянская, у добрым сэнсе вясковая. Нашы людзі ніколі не былі багатымі. Я, адкрываючы ў Петрыкаве новае радовішча (ды і раней), ставіў задачу, каб прадпрыемства («Беларускалій». — **«Зв»**.) прывяло ў парадак вакол сябе тэрыторыі і сам Петрыкаў. Не ўсё яшчэ зроблена, але ў Петрыкаў прыемна заехаць. Гэта ўжо сучасны горад, мае перспектыву. Потым, «Слаўкалій» будуе радовішча каля Любані. Пастаўлена задача і яму, прыватніку, каб ён Любань прывёў у парадак і ўсё навокал. Пабудуе, будзе гэтым займацца», — расказаў Прэзідэнт.

Такое заданне ён дае і «Беларуснафце». Гомельская вобласць, дзе размяшчаецца прадпрыемства, па словах Прэзідэнта, — рэгіён, які асабліва пацярпеў ад чарнобыльскай трагедыі.

«Падумайце, як вы там прыкладзяце свае намаганні, каб дапамагчы гэтай вобласці. Хоць бы ў тых месцах, дзе вы працуеце. Ведаю, што нямала робіце, але разумееце: гэта бедная тэрыторыя. Ад сельскай гаспадаркі асабліва багатым не будзеш. Але робіць яны вялікую справу, і ім неабходна дапамагаць», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

На сустрэчу з кіраўніком краіны Аляксандр Ляхаў прынёс геалагічныя карты, каб наглядна расказаць пра перспектыву галіны. Прэзідэнт з усмешкай адзначыў: «Я, калі глянуў на гэту карту, дык мне здалося: як у Эміратах у нас нафты».

Марыя ДАДАЛКА.

Каментарый у тэму

Генеральны дырэктар «Беларуснафты» Аляксандр ЛЯХАЎ канстатуе, што ў галіне здабычы нафты ў краіне намецілася значнае прасоўванне як вынік маштабных геолагаразведачных работ і прымянення новых тэхналогій у сферы.

«Апошнія гады здабыча нафты расце з тэмпамі да 20 тысяч тон у год. Чаканая здабыча па гэтым годзе складзе мінімум 1,7 мільёна тон. Планаванне найбліжэйшай дзейнасці «Беларуснафты» будзе накіравана на далейшы рост здабычы нафты на тэрыторыі краіны. Важнай тэмай размовы ў Прэзідэнта была здабыча ў паўднёвых раёнах Гомельскай вобласці, дзе пасля аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі практычна геолагаразведачныя работы на нафце-газе не праводзіліся», — сказаў спецыяліст.

Па яго словах, у гэтым годзе да такіх работ вярнуліся на тэрыторыі Рэчыцкага і Ельскага раёнаў, у наступным плануюць сейсмаразведачную дзейнасць у Нараўлянскім і Хойніцкім раёнах. Работы ў Рэчыцкім і Ельскім раёнах павінны прывесці да бурэння пошукавай свідравіны ў пачатку 2023 года.

«Далей плануем раскансервацыю старых свідравін, прабураных яшчэ да аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, і бурэнне новых свідравін, калі для гэтага будзе геалагічная перспектыва. Таму мы ацэньваем магчымасць росту здабычы нафты ў краіне як досыць перспектыўную», — акцэнтуе гендырэктар.

У планах кампаніі — здабываць у паўднёвых раёнах Гомельшчыны да 2025 года каля 150 тысяч тон нафты.

«Сёння мы робім праекты на выкананне работ, і я лічу, што рухаемся па плану. Там, дзе магчыма, будзем максімальна паскараць тэрміны гэтых работ», — падкрэсліў Аляксандр Ляхаў.

Наконт дзейнасці ў Расіі ён расказаў, што там працуюць прадпрыемствы па бурэнні, рамонце свідравін і здабычы. Сваю работу «Беларуснафта» вядзе ў Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе.

«Гэты год быў прадукцыйным для нас. У складзе прадпрыемства з'явіўся свой ліцэнзійны ўчастак, які размешчаны ў Ямала-Ненецкай акрузе. То-бок прадпрыемства скампанавана трыма ліцэнзійнымі ўчасткамі. Усе яны прымыкаюць адзін да аднаго, стварачы добрыя інфраструктурныя перадумовы для вытворчых работ. Па аб'ёмах здабычы газу мы плануем выйсці ў гэтым годзе да 1,2 мільярда кубічных метраў, па здабычы нафты і газакандэнсату — да 300 тысяч тон па выніках гэтага года», — паведаміў Аляксандр Ляхаў.

Пацікавіліся журналісты планамі па развіцці электразаправак. Як адзначыў гендырэктар, сетка электразаправак «Беларуснафты» налічвае 457 адзінак, да канца года гэта лічба павялічыцца да 600.

«Гэтага дастаткова для сённяшняй колькасці электрамабіляў. Больш за тое, працуем на апярэджанне. Гэта стварае перадумовы для пераходу суб'ектаў гаспадарання і насельніцтва на электратранспарт», — сказаў Аляксандр Ляхаў.

У планах таксама будаўніцтва хуткіх, больш магутных зарадных комплексаў. Вытворца абсталявання для такіх станцый — прадпрыемства «Віцязь» у Віцебскай вобласці.

Наталля КАЧАНАВА:

«Беларусь ганарыцца сваімі жанчынамі»

Спікер верхняй палаты беларускага парламента прадставіла Беларусь на XIII саміце жанчын — спікераў парламентаў

У Вене стартаваў XIII саміт жанчын-спікераў парламентаў. Ён прысвечаны ролі жанчын у барацьбе з пандэміяй і аднаўленні пасля яе з пазіцыі гендарнай роўнасці.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, зварот да ўдзельніцаў накіравала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА. У ім спікер адзначыла, што тэма форуму актуальная для ўсіх краін, бо эпідэмія каранавіруснай інфекцыі ахапіла практычна ўсю планету і пагражае жыццю і здароўю людзей самых розных дзяржаў.

Наталля Качанава звярнула ўвагу ўдзельніц саміту, што ў барацьбе з пандэміяй кожная краіна прымае меры з улікам сваёй нацыянальнай спецыфікі, сацыяльнай сістэмы і магчымасцяў эканомікі і расказала аб тым шляху, які выбрала наша краіна:

— У Беларусі за перыяд пандэміі назапашаны каштоўны вопыт: рэалізоўваецца шырокі комплекс санітарных і медыцынскіх мерапрыемстваў па супрацьдзеянні распаўсюджванню інфекцыі і лячэнні людзей. Напрацаваныя механізмы ўзаемадзеяння органаў улады. Парламентам і ўрадам прыняты адпаведныя прававыя акты, — патлумачыла яна.

Спікер Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на тым, што пандэмія каранавіруса прымусіла ўсіх па-іншаму паглядзець на каштоўнасць жыцця і здароўя, а самае галоўнае — змянілася стаўленне людзей да медыкаў: значна павысілася сацыяльная значнасць іх працы.

— Беларускую медыцыну можна па праве назваць жаночай, — лічыць Наталля Качанава і тлумачыць чаму. — У арганізацыях аховы здароўя Беларусі працуе 75 % спецыялістаў-жанчын, і кожная без выключэння на сваім узроўні выразна выконвае свае прафесійныя задачы — аддана і з самааддачай. Нашы ўрачы змагаюцца за кожнае жыццё!

Наталля Качанава пераканана: беларуская сістэма аховы здароўя змагла вытрымаць сур'ёзную нагрузку, таму што ў свой час былі захаваны ўсе яе звёны: санэпідслужба, інфекцыйныя бальніцы, фельчарска-акушэрскія пункты і бальніцы ў самых невялікіх раённых цэнтрах і, галоўнае, — спецыялісты.

— У Беларусі цэняць сапраўдных герояў барацьбы з пандэміяй, — падкрэсліла яна ў сваім відэазвароце. — Па рашэнні кіраўніка дзяржавы за самаадданую працу медыцынскія работнікі былі ўзнагароджаны дзяржаўнымі ўзнагародамі, падзякамі, ганаровымі граматамі. Менавіта ўрачу-інфекцыяністу ўпершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі прысвоена ганаровае званне «Народны ўрач Беларусі».

Наталля Качанава нагадала, што, акрамя таго, дзяржава знайшла магчымасці для вылучэння дадатковых фінансавых рэсурсаў для павышэння аплаты працы медыцынскім работнікам.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента расказала таксама і аб важнай тэндэнцыі падчас пандэміі, якой стала актыўнае выкарыстанне ў сістэме працоўных адносін новых гнуткіх форм занятасці. Менавіта з гэтай прычыны ў нашай краіне на працягу ўсяго перыяду пандэміі не было масавых скарачэнняў працоўных месцаў.

Спынілася Наталля Качанава і відэазвароце і на беларускім вопыце ў дачыненні да адной з уразлівых катэгорый у перыяд пандэміі — сем'ях з дзецьмі. У прыватнасці, для малазабяспечаных шматдзетных сем'яў у Беларусі былі прынятыя меры дадатковай матэрыяльнай падтрымкі.

— З пачаткам пандэміі аператыўна перабудавана работа па сацыяльным абслугоўванні насельніцтва. Дамы-інтэрнаты для пажылых людзей працавалі ў рэжыме поўнай ізаляцыі, медыцынскі персанал працаваў вахтавым метадам, што дазволіла мінімізаваць рызыкі распаўсюджвання інфекцыі, — расказала яна. — Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання арганізавалі бясплатную дастаўку на дом прадуктаў харчавання, прадметаў першай неабходнасці і лекаў непрацаздольным грамадзянам.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента пераканана: абраная нашай краінай мадэль рэагавання і падтрымкі насельніцтва ў пандэмію даказала свою эфектыўнасць.

У прыватнасці, не дапушчана зніжэнне ўзроўню заработнай платы, выкананы ўсе сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы, насельніцтву ў поўным аб'ёме забяспечаны пенсійныя выплаты.

— Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава, у аснове якой — непахісныя агульначалавечыя прынцыпы, — падкрэсліла яна. — Дасягненне роўнасці мужчын і жанчын ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, забеспячэнне роўных магчымасцяў, павышэнне ролі жанчыны ў грамадстве заўсёды былі і будуць найважнейшымі прыярытэтамі на шляху ўстойлівага развіцця Беларусі.

Сёння Беларусь уваходзіць у першую трыццатку дзяржаў па такім крытэрыі, як жаночае прадстаўніцтва ў органах заканадаўчай улады. Жанчыны займаюць высокія пасады ў органах дзяржаўнага кіравання, складаюць траціну ад агульнай колькасці членаў парламента.

— Жанчыны ўносяць важкі ўклад у аднаўленне і развіццё нацыянальных традыцый, распрацоўку стваральнага парадку развіцця, у міжнацыянальны дыялог, вырашэнне праблем беднасці і эканамічнай няроўнасці, — расказала Наталля Качанава.

Яна адзначыла, што большасць жанчын сталі сур'ёзнай апорай беларускай дзяржаве ў складаны перыяд знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы і спробы змены канстытуцыйнага ладу пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года.

— Мы не дазволілі ўцягнуць жанчын у нацыянальнае супрацьстаянне, — расказала яна і падкрэсліла: Беларусь ганарыцца сваімі жанчынамі. Імкненне да поспеху і дасканаласці ва ўсім — гэта фактычна нацыянальныя рысы беларускіх жанчын.

Таму задача парламентарыяў, лічыць яна, — стварацьспрыяльныя ўмовы і стымулы для самаразвіцця і актыўнага ўдзелу жанчын у палітычным, эканамічным і сацыяльным жыцці нашых краін.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

Парламенцкі дзённік

СІЛА ПРАВА СУПРАЦЬ ПРАВА СІЛЫ

Беларускія дэпутаты прапануюць актывізаваць выпрацоўку выразных падыходаў па барацьбе з тэрарызмам у інтэрнэце. З такім пасылам да сусветнай супольнасці звярнуўся ў сваім відэавыступленні на пятай Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.

«Кіруючыся Глабальнай контртэрарыстычнай стратэгіяй ААН, прапануем актывізаваць выпрацоўку выразных падыходаў па барацьбе з тэрарызмам у сетцы Інтэрнэт ва ўсіх яго формах і праявах. На дасягненне гэтай жа мэты накіравана ініцыятыва кіраўніка беларускай дзяржавы аб фарміраванні «пояса лічбавага добрасуседства», — адзначыў спікер ніжняй палаты парламента.

Канферэнцыя праходзіць на тэму «Парламенцкае лідарства ў імя эфектыўнага шматбаковага падыходу, які забяспечвае мір і ўстойлівае развіццё народанасельніцтву і планеце». Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, дадзеная тэма як ніколі актуальная, бо колькасць пагроз свету і бяспецы не памяншаецца, а Мэты ўстойлівага развіцця становяцца ўсё больш уяўныя.

«Пандэмія абвастрыла ранейшыя і справакавала новыя негатыўныя працэсы. Замест разрадкі напружанасці, умацавання даверу і супрацоўніцтва множацца персанальныя абмежаванні, эканамічныя санкцыі, блакады і кампаніі па падрыве суверэнітэту. Група ўплывовых краін спрабуе падмяніць міжнароднае права прыдуманымі ёю правіламі. Пашырэнне НАТА на ўсход, насаджэнне звонку «каляровых рэвалюцый» і спроб калектыўнага Захаду перагледзець вынікі Другой сусветнай вайны — гэта шляхі, што вядуць свет да катастрофы», — падкрэслівае старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Ён сцвярджае, што нельга дамагчыся доўгатэрміновага справядлівага вырашэння пытанняў міжнароднага значэння сілавым шляхам. Інакш у свеце будзе панаваць права сілы, а не сіла права.

Асаблівыя надзеі нашы парламентарыі ўскладаюць на ініцыятыву Прэзідэнта Беларусі аб правядзенні шырокага міжнароднага дыялогу для аднаўлення даверу і ўмацавання бяспекі. «Разлічваем на вашу падтрымку ў яе рэалізацыі, у тым ліку для вырашэння такіх задач, як барацьба з усімі відамі і формамі сучаснага рабства, гандлем людзьмі і незаконным абаротам наркатычных рэчываў», — звяртаецца да калег Уладзімір Андрэйчанка.

Таксама ў сваім выступленні ён акцэнтаваў увагу на неабходнасці ўмацавання супрацоўніцтва ў справе пераадолення і папярэджання экалагічных выклікаў і павышэння ролі моладзі ў пабудове бяспечнага свету.

Пятая Сусветная канферэнцыя спікераў парламентаў складаецца з двух этапаў. Першая частка канферэнцыі прайшла ў рэжыме анлайн у жніўні 2020 года. Вочная частка, а таксама Саміт жанчын-спікераў праходзіць з 6 да 8 верасня 2021 года ў Вене. Яна ўключае дэбаты і панэльныя дыскусіі па актуальных тэмах, якія накіраваны на прамое ўзаемадзеянне паміж лідарамі парламентаў.

Марыя ДАДАЛКА.

На свае вочы

Вяскоўцы будучага ў Палацы Незалежнасці

Для жыхароў аграгарадка Ціхінічы і работнікаў аднайменнага сельгаспрадпрыемства Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці правялі экскурсію ў Палацы Незалежнасці. 13 жніўня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пабываў у гэтым аграгарадку і асабіста запрасіў вяскоўцаў прыехаць у Мінск.

Інжынер-механік, прадавец, кухар, бухгалтар, трактарыст-машыніст, аператар машыннага даення, жывёлавод, аграном, электрагазазваршчык, настаўнік, сацыяльны работнік — няпоўны спіс прафесій некалькіх дзясяткаў жыхароў аграгарадка, якія наведалі Палац Незалежнасці. У зале ўрачыстых цырымоній ад імя кіраўніка дзяржавы іх вітала прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант.

Прэс-сакратар нагадала, што ў Ціхінічах па даручэнні Прэзідэнта ўжо арганізавалі канцэрт з удзелам беларускіх артыстаў, а наведванне палаца — гэта працяг дружбы з кіраўніком дзяржавы. «У яго сапраўды засталіся цудоўныя ўражанні ад наведвання Ціхініч. Мы ўсе пастаянна ўспамінаем. Гэта такі райскі куток. Мы ненадоўга прыехалі, але, сапраўды, ваш край нам запомніўся», — перадае словы Наталлі Эйсмант БелТА.

У жніўні Аляксандр Лукашэнка не толькі наведаў сельгаспрадпрыемства і фізкультурна-аздараўленчы комплекс у самім аграгарадку, але і пагутарыў з мясцовымі жыхарамі. Нагода для прыезду — паглядзець, як на прыкладзе дадзенага аграгарадка рэалізоўваецца праект «Вёска будучыні».

Фота БелТА.

З караваем

САМАЕ ХЛЕБНАЕ СВЯТА

Брэстчына адсвяткавала «Дажынкі» ў Лагішыне Пінскага раёна

У мінулую суботу хлебаробы Брэстчыны сабраліся ў Лагішыне, каб падвесці вынікі ўборкі ўраджаю і ўшанаваць пераможцаў сёлетняга жніва. Па дарозе на фестываль яго ўдзельнікам святочны настрой ствараліся шматлікія саламяныя кампазіцыі, якія ў асноўным падобныя на арт-аб'екты. Са звычайных цюкоў салому майстры стварылі млыны, трактары, казачных герояў і цэлыя сюжэты на тэму вясковай працы.

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

А вось старадаўні Лагішын сустрэў гасцей абноўлены і памаладзелы. Хто даўно не быў тут, прызнаваў: гарадскі пасёлак не пазнаць. Цэлы год шчыравалі будаўнікі, камунальнікі, іншыя спецыялісты. Праведзены рэканструкцыя і рамонт шэрагу аб'ектаў. Ажыццёўлена вялізная работа па добраўпарадкаванні. Шчыравалі і самі жыхары Лагішына, ім на дапамогу прыязджалі работнікі ўстаноў і арганізацый раёна. Зрабілі так, што не сорамна прыняць любых гасцей.

Госці прызналі, што новы добраўпарадкаваны сквер недалёка ад аўтастанцыі стаў упрыгажэннем пасёлка. Каваны масток праз канал адразу настройвае на рамантычны лад, для спатканняў усё ёсць: утульная лаўка, прыгожыя альтанкі і нават скульптура ваўка-заступніка — цудоўная нагода згадаць гісторыю, пацікавіцца легендамі пра ўзнікненне пасёлка, якому без нечага 500 гадоў.

Ды і сам будынак аўтастанцыі як візітоўка Лагішына займеў зусім іншы, сучасны, выгляд. У населеным пункце адрамантавалі бальніцу, лазню, добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол сацыяльна-педагагічнага цэнтра і агульнаадукацыйнай школы. Узведзена новая кацельная, пракладзены цеплавыя сеткі, новыя ніткі водаправода і каналізацыі. Праведзены рамонт фасадаў жылых дамоў на ўездзе ў пасёлак.

А вось дзіцячая школа мастацтваў напярэдадні была адкрытая пасля капітальнага рамонту. Цяпер больш за сто хлопчыкаў і дзяўчынак займаюцца музыкай у камфортных умовах. Дзякуючы «Дажынкам» дачакалася рамонту і мясцовая бібліятэка, якая абслугоўвае больш за тысячу чытачоў.

Традыцыйна разьбяры правялі ў сталіцы «Дажынак» пленэр, а работы падарылі населенаму пункту. Цяпер драўляныя скульптуры гістарычных асоб аздабляюць сквер каля мясцовай царквы. А работнікі сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі правялі тут конкурс прафесійнага майстэрства «Зелянбуда» і пакінулі конкурсныя работы — цудоўныя ландшафтныя кампазіцыі, клумбы.

Адным словам, сацыяльны праект «Дажынкі» ўдаўся, ды і свята таксама. Зранку разгарнуў свае гандлёвыя павільёны шматаблічны кірмаш. А само святкаванне пачалося з парада дэлегацый усіх раёнаў вобласці. Кожны раён нёс свае каравай і ўпрыгожаны сноп, падкрэсліваючы тым самым, што адзначаецца самае хлебнае свята года.

Брэсцкая вобласць сёлета сабрала 1 мільён 176 тысяч тон збожжавых і зернебабовых культур, 140 тысяч тон рапсу. З гектара атрымалі ў сярэднім 35 цэнтнераў збожжа. Хлебаробаў вітаў **кіраўнік справы Прэзідэнта, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Брэсцкай вобласці Валерый ІВАНОЎ:**

— Сёлета Брэсцкая вобласць з'яўляецца адным з лідараў па намалоце збожжа і ўносіць важкі ўклад у рэспубліканскі каравай. Поспех стаў вынікам працы ўсіх аграрыяў, гаспадарскіх адносін да зямлі, выкарыстання найноўшых тэхналогій.

За добрую работу механізатарам, кіроўцам, спецыялістам гаспадарак падзякаваў **старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

— З уборачнай кампаніяй справіліся добра, — адзначыў кіраўнік рэгіёна. — Нягледзячы на капрызы надвор'я, вынік атрымалі прыстойны. Але ж уборка ўраджаю не скончылася, цяпер на чарзе — кукуруза, працягваецца ворыва, на чарзе — сяўба азімых. Думаю, усе асенніе работы правядзём якасна і ў тэрмін.

Падчас урачыстасці на стадыёне адбылося ўзнагароджанне пераможцаў сёлетняга жніва. Сярод раёнаў найлепшым прызнаны Камянецкі. У спаборніцтве гаспадарак першынство падзялілі ААТ «Савушкіна пушча» і «Макарава-Агра» — абодва з Камянецкага раёна.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
г. п. Лагішын.

Прысуд вынесены

Змова з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам

Мінскі абласны суд прызнаў Марыю Калеснікаву і Максіма Знака вінаватымі і прысудзіў да 11 і 10 гадоў пазбаўлення волі адпаведна, паведамляе БелТА.

Калеснікава будзе адбываць пакаранне ў калоніі агульнага, Знак — узмоцненага рэжыму.

Суд прызнаў абодвух вінаватымі ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 1 арт. 357, ч. 3 арт. 361, ч. 1 арт. 361-1 КК. Гаворка ідзе, у прыватнасці, пра змову, якая была здзейснена з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам, стварэнне экстрэмісцкага фарміравання і кіраўніцтва такім фарміраваннем, публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады.

Як раней адзначалі ў Генпракуратуры, абвінавачаныя сумесна з іншымі асобамі не пазней за 16 ліпеня 2020 года ўступілі ў таемную змову з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам.

Згодна з планам, яны ў розных месцах, абвясціўшы і пазіцыянуючы сябе прадстаўнікамі пераважнай большасці грамадзян Беларусі, рыхтавалі і публічна агучвалі заявы пра перамогу на выбарах кандыдата Святланы Ціханоўскай, страту народам Беларусі даверу да органаў улады і кіравання, слабасць дзеючай улады. Заклікалі да забастовак на дзяржаўных прадпрыемствах з вылучэннем выключна палітычных патрабаванняў як легальнага спосабу выказвання свайго меркавання.

На прэс-канферэнцыі, праведзенай 18 жніўня 2020 года ў Мінску, Калеснікава, Знак і шэраг іншых асоб заявілі аб стварэнні па ініцыятыве Святланы Ціханоўскай так званай каардынацыйнай рады як адзінага прадстаўнічага органа беларускага грамадства для арганізацыі перадачы ўлады.

Хаваючы свой матыў, у якасці афіцыйнай мэты стварэння каардынацыйнай рады яны заявілі арганізацыю працэсу пераадолення палітычнага крызісу, забеспячэнне згоды ў грамадстве, а таксама абарону суверэнітэту і незалежнасці Беларусі.

Разам з тым, адзначылі ў Генпракуратуры, сапраўдная мэтай стварэння каардынацыйнай рады была каардынацыя пратэснай актыўнасці, у тым ліку па арганізацыі і правядзенні дзеянняў, накіраваных на захоп дзяржаўнай улады і змену палітычнага кіраўніцтва неканстытуцыйным шляхам, распальванне палітычнай, ідэалагічнай і сацыяльнай варожасці ў грамадстве, а таксама публічныя заклікі да перашкоды законнаму функцыянаванню органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

У свеце

ТАЛІБЫ ЗАЯВІЛІ АБ ЗАКАНЧЭННІ ВАЙНЫ Ў АФГАНІСТАНЕ

Вайна ў Афганістане скончылася. Пра гэта заявіў прадстаўнік руху «Талібан» Забіула Муджахід.

Раней прадстаўнік «Талібана» аб'явіў, што баевікі цалкам кантралююць правінцыю Панджшэр. Ён адзначыў, што адны паўстанцы збеглі з мяцежнай правінцыі, а іншыя былі забітыя ў баях. Муджахід таксама паабяцаў, што талібы не крануць мірных жыхароў Панджшэра.

Адразу пасля гэтай заявы Фронт супраціўлення, які паўстаў супраць «Талібана», напісаў у Twitter, што тэрарысты распаўсюджваюць ілжывыя навіны пра сваю перамогу. У паведамленні мяцежнікаў гаварылася, што яны захавалі ўсе стратэгічныя пазіцыі, каб працягваць барацьбу з талібамі. 6 верасня таксама з'явіліся весткі, што былы віцэ-прэзідэнт Афганістана Амрула Салех, які падтрымаў вайну супраць талібаў і які раней знаходзіўся ў Панджшэры, збег у Таджыкістан. Адразу тры выданні пацвердзілі знаходжанне палітыка ў постсавецкай рэспубліцы. Яго канкрэтнае месцазнаходжанне не раскрываецца.

Фронт супраціўлення паўстаў супраць «Талібана» практычна адразу пасля таго, як 15 жніўня баевікі без бою ўвайшлі ў Кабул.

ЯДНАННЕ СЛОВАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цэнтральнымі падзеямі Дня пісьменства былі ўрачыстае адкрыццё і ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. **Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** зачытаў на галоўнай сцэне прывітанне Прэзідэнта Беларусі ўдзельнікам і гасцям свята. Таксама намеснік прэм'ер-міністра адзначыў:

— Вялікая каманда працавала над тым, каб прыўнесці ў праграму рэспубліканскага Дня пісьменства ў Капылі нешта новае. Свята праходзіць у Год народнага адзінства, таму на тэрыторыі горада размешчана шмат тэматычных экспазіцый, прысвечаных гісторыі краіны, яе аб'яднанню ў 1939 годзе, ваеннаму перыяду і людзям, якія ўнеслі значны ўклад у яе развіццё. У прыватнасці, зроблена гэта для таго, каб маладое пакаленне бачыла, праз які цярністы шлях прайшла наша краіна да самастойнасці, незалежнасці. Для таго, каб беларусы маглі фарміраваць і развіваць дзяржаву так, як ім гэтага хочацца.

Арганізатары, якія падчас прэс-канферэнцый анансоўвалі яскравы канцэрт, не падманулі. Сапраўды, вакол сцэны былі ўсталяваны ЖК-экраны, на якія транслiраваліся праекцыі дубоў і млечнага шляху. Выглядала гэта вельмі рэалістычна. З віншавальнымі словамі да гледачоў звярнуўся нават Алег Навіцкі — беларускі касманаўт, які зараз знаходзіцца на касмічнай станцыі. Відэазварот Навіцкага транслiраваўся на галоўнай сцэне. Таксама гасцей і жыхароў горада віталі старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Пярцоў і Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін.

Падчас урачыстага адкрыцця **Аляксандр ТУРЧЫН** адзначыў:

— Міншчына не ўпершыню прымае такое знакавае мерапрыемства, і выбар Капыля абсалютна не выпадковы. Больш за 50 вядомых пісьменнікаў і паэтаў звязаны з Капыльшчынай. Мы імкнуліся зрабіць горад яшчэ больш прыгожым.

Размах фестывалю насамрэч уразіў. Канца пляцоўкам не было відаць, здавалася, што яны расцягнуліся па ўсім горадзе. На фестывалі, акрамя тыповых шапікаў з вулічнай ежай, было шмат тэматычных, прымеркаваных да свята. Напрыклад, на адной з пляцовак можна было даведацца, якога росту былі Цётка, Якуб Колас і Уладзімір Караткевіч. Самым высокім аказаўся Максім Багдановіч — яго рост быў 183 сантыметры. Таксама прапаноўвалі «чаяпіцце з геніем». Вось інструкцыя: узяць кубак, прачытаць уголас выцягнутую са скрыні цытату якога-небудзь беларускага літаратара, усміхнуцца, выпіць гарбату, уяўляючы, што робіш гэта разам з аўтарам цытаты, і, вядома ж, атрымаць асалоду. Уражвалі гледачоў павільён «Памяць» з прэзентацыяй праекта «Партызаны Беларусі», ваенна-гістарычная рэканструкцыя «Лаўскі бой»...

На тэматычнай пляцоўцы, прысвечанай 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны, гледачы пераносіліся ў той трагічны і гераічны час. Вядома, быў шанц узяць аўтограф у пісьменніка. А можна было сфатаграфавацца і з чалавекам у шкляным касцюме. Дарослыя цікавіліся незвычайным адзеннем артыста нават у большай ступені, чым дзеці. У адным з шапікаў можна было пачаставацца экалагічнай гарбатай. У прахалоднае надвор'е — самае тое. Адбылося і адкрыццё Алеі пісьменнікаў з QR-кодамі. Зараз растлумачым, што гэта значыць. З алеяй усё зразумела: дрэвы, лаўкі, спакой. А пры чым тут QR-коды? Каля кожнай лаўкі ўсталявалі літары. Дарэчы, гэта творчы праект Саюза мастакоў Беларусі. Літары сімвалізуюць імёны знакамітых пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў Капылі. Напрыклад, пад «А» масткі размясцілі клёны Адама Бабарэкі і Алеся Бельскага, пад «Д» — Данізля Набароўскага. Усяго мастакі зрабілі 17 элементаў. Каля кожнай лаўкі — QR-код. Наводзіш на яго тэлефон, скануеш спасылку і трапляеш на старонку, якая распавядае біяграфію пісьменніка. Усё працуе, мы праверылі.

Сапраўды, дзякуючы рамонтным работам Капыль набыў новае аблічча. Ігар Петрышэнка расказаў, што падчас падрыхтоўкі да Дня пісьменства ў Капылі адрамантавалі каля 500 аб'ектаў. Хто ведае, мабыць, горад стане новай папулярным турыстычным пунктам на карце Беларусі?

Каля пісьменніцкай алеі зладзілі выстаўку дзіцячых малюнкаў. Цікава, што некаторыя работы былі насамрэч незвычайныя. Выкананыя ў традыцыях маляваных дываншоў, работы нагадвалі лубачныя карціны. Яшчэ нам вельмі спадабаўся малюнак 11-гадовага Івана Жыбура. Карціна мае назву «У келлі» і ўяўляе сабой смелую сумесь авангарда і аналітычнага кубізму Пікасо. Гэта мы кажам без іроніі: у прадстаўленых малюнках бачны аўтарскі, наватарскі падыход да творчасці. З таксама цікавых прыкладаў можна згадаць інсталяцыі кніг, якія расцягнуліся амаль на кіламетр. На вялікіх, амаль у рост даслага чалавека, муляжах разгорнутых кніг былі намаляваны краявіды Беларусі, партрэты знакамітых пісьменнікаў, напісаны прыказкі і радкі з вершаў. Інсталяцыі былі створаны працаўнікамі розных устаноў: ад абласных бібліятэк да дзіцячых садкоў.

Каля Капыльскай школы мастацтваў размясцілася «Літаратурная кавярня». На гэтай пляцоўцы сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі чыталі свае вершы. Больш за ўсё запомніўся выступоўца, які спяваў песню пра мядзведзіка. У казачным лесе медзведзяня зладзіла канцэрт, а на пні-барабане яму акампаніраваў заяц. Маленькія слухачы былі ў захапленні. І мы, шчыра кажучы, таксама.

Нягледзячы на тое што Дзень беларускага пісьменства — у першую чаргу свята, не трэба забывацца і пра асноўную мэту фестывалю: прасоўванне і папулярызацыю беларускай літаратуры. Так, седзячы наводдаль ад асноўных пляцовак, двое сталых мужчын абмяркоўвалі стан сучаснай літаратуры. Адзін з іх скардзіўся, што кнігі беларускіх пісьменнікаў амаль не чытаюць. Другі слухаў і пагаджаўся. У гэтым ёсць пэўны сэнс. Безумоўна, літаратура не загінула. Яна і па сённяшні дзень мае моцны ўплыў на грамадства. Але неабходна шукаць новыя сродкі, якія дапамаглі б зацікавіць большае кола людзей. У першую чаргу тых, хто з-за хуткага тэмпу жыцця папросту не паспявае адкрыць кнігу. Мяркуем, што фестывалі, падобныя да Дня беларускага пісьменства, здольныя ў нейкім сэнсе змяніць сітуацыю.

А тым часам Добруш ужо рыхтуецца да свята: наступны, XXIX Дзень беларускага пісьменства пройдзе менавіта там, на радзіме Івана Шамякіна.

• Меркаванне

Пісьменнік і дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК расказаў «Звяздзе» аб уласных уражаннях і адметнасцях Дня беларускага пісьменства ў Капылі:

— Кожнае свята Дня беларускага пісьменства заўсёды мае асаблівасці. Самае цікавае, што калі мы ехалі ў Капыль, то думалі аб тым, чым адметная гэтая зямля. Яна нарадзіла больш за 50 пісьменнікаў! Я не ведаю, ці ёсць у краіне такі раён, багаты на беларускую літаратуру. Мяне вельмі ўразіла, як простыя людзі падыходзяць да пісьменнікаў і выдаўцоў, хочуць з імі сфатаграфавацца і проста паразмаўляць. Калі наведваеш такія невялікія мястэчкі, больш яскрава адчуваеш тое, што людзі любяць літаратуру і культуру, цягнуцца да яе. У Мінску ты ўжо даўно прызвычаіўся да пісьменніцкага кола, а ў маленькіх гарадках і вёсках усё гэта ўспрымаецца па-іншаму. Ва ўсялякім разе, мне падалося, што жыхары і госці Капыля ў гэты дзень адчувалі святочнасць у сэрцы. Гэта было зразумела па іх тварах, па іх словах. І гэта самае галоўнае.

Арына КАРПОВІЧ.

ПЕРАМОЖЦЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ПРЭМІІ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Прэмію атрымлівае Валянціна ПАЛІКАНІНА.

Па традыцыі Дня беларускага пісьменства, была ўручана Нацыянальная літаратурная прэмія. Гэта свайго роду вынік вялікай, шматгадовай працы мноства беларускіх пісьменнікаў. Прэмія ўручалася ў шасці намінацыях: «Найлепшы твор (зборнік) паэзіі», «Найлепшы твор прозы», «Найлепшы твор публіцыстыкі», «Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва», «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі» і «Дэбют». Нагадаем, што на прэмію прэтэндавалі 59 пісьменнікаў.

Падчас віншавання лаўрэатаў **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** адзначыў:

— Я ўпэўнены, што дзякуючы нашаму конкурсу ў Беларусі будуць нараджацца новыя пісьменнікі і новыя творы, якія дапамогуць пабудаваць моцную, квітнеючую і незалежную Беларусь.

Пераможцамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі сталі: **Віктар ШНІП** у намінацыі «Найлепшы твор (зборнік твораў) паэзіі за кнігу вершаў «Белае, чорнае і залатое»; **Віктар ПРАЎДЗІН** у намінацыі «Найлепшы твор прозы» за кнігу «Парыж, Эйфелева вежа і...»; **Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** у намінацыі «Найлепшы твор літаратурнай крытыкі» за кнігу «Пухавіччына. Літаратурнае гняздо Беларусі»; **Аляксандр РАДЗЬКОЎ** у намінацыі «Найлепшы твор публіцыстыкі»; **Валянціна ПАЛІКАНІНА** ў намінацыі «Найлепшы твор для дзяцей і юнацтва» за кнігу «За ўсіх мацнейшая дабрыня»; **Кацярына СТРОЙЛАВА** ў намінацыі «Дэбют» за кнігу «Насустрач Любві».

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ адзначыў:

— Мяркую, што мы з упэўненасцю можам сказаць: селёта пісьменнікі святкуюць літаратурныя «Дажынкі» — падводзім вынікі сваёй працы. Беларуская кніга стала здабыткам свайго народа. Вельмі прыемна, што ў пісьменніцкія рады прыйшлі новыя таленты.

Соль зямлі капыльскай

Больш як дваццаць дакладаў было прадстаўлена на Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў Капылі. Гісторыю, культуру, літаратуру, народны быт і традыцыі Капыльшчыны навукоўцы, практыкі, прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў паказалі праз асобу, людзей, якія ўнеслі найбольшы ўклад у развіццё роднага краю.

Напрыклад, «Людзі Капыльшчыны, якія праславілі беларускую навуку: Герой Беларусі Высоцкі Міхаіл Сцяпанавіч», «Сэрцам адданы роднай зямлі...»: А. А. Кавaленя — выдатны вучоны і сапраўдны патрыёт», «Міхаіл Мароз, ураджэнец Капыльшчыны, першы пасол Савецкай Беларусі», «Цімкавічы і цімкаўцы ў жыцці і творчасці Кузьмы Чорнага» і іншыя. Канферэнцыя мела некалькі блокаў: гістарычны, мовазнаўчы, літаратуразнаўчы.

— Беларуская зямля ганарыцца прадстаўнікамі старэйшага пакалення. Разам з тым, і сучаснікі працягваюць тыя традыцыі, якія былі закладзены нашымі папярэднікамі, — расказаў «Звяздзе» **акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ.** — Удзельнікі канферэнцыі імкнуцца данесці да шырокай грамадскасці моладзі тыя навуковыя напрацоўкі, якія зрабілі вучоныя аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, а таксама вышэйшых навучальных устаноў нашай краіны. На канферэнцыю прыехалі людзі, якія прафесійна займаюцца вывучэннем айчыннай гісторыі, культуры, краязнаўства, асвятленнем праблем археалогіі. Навукоўцы ўзнялі цэлы пласт вядомых дзеячаў капыльскай зямлі. Гэта работнікі сельскай гаспадаркі, творцы, настаўнікі, якія сеюць добрае, разумнае, вечнае. Канферэнцыя прысвечана асвятленню старонак гісторыка-культурнай спадчыны не толькі Капыльскага краю, але і наогул нашай Беларусі. Капыльская зямля славіцца не толькі высокімі ўраджаямі і намалотамі, але і багатымі гісторыяй, культурай, літаратурнай творчасцю, народнымі традыцыямі, а галоўнае — людзьмі, што нарадзіліся тут і сталі гонарам раёна і краіны. Менавіта людзі — неацэннае багацце Капыльшчыны. Яны паказалі сябе ў мірнай працы, адстойвалі свабоду і незалежнасць Радзімы ў віхрах ваенных выпрабаванняў. Не ў кожным раёне ёсць такая плеяда выдатных дзеячаў нацыянальнай літаратуры, культуры, мовы. Гэта дзесяць Герояў Савецкага Саюза, дзевяць Герояў Сацыялістычнай Працы, Герой Рэспублікі Беларусь Міхаіл Высоцкі. Гэта соль зямлі капыльскай. Спадзяюся, што непарыўная нітка пакалення будзе працягвацца.

Фота Алены МАЗАВЕЦ.

Аляксандр КАВАЛЕНЯ ўручае ўзнагароду пераможцы конкурсу.

Дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Ігар КАПЫЛОЎ падкрэсліў, што гэта традыцыйнае мерапрыемства, якое ладзіцца з самага пачатку правядзення Дня беларускага пісьменства:

— Тэматыка сёлетняй канферэнцыі звязана з Годам народнага адзінства. Удзел у ёй узялі не толькі вядучыя вучоныя. Вынікамі сваіх навуковых даследаванняў падзяліліся літаратары, творчая інтэлігенцыя раёна.

Падчас «Капыльскіх чытанняў» адбылася прэзентацыя 23-томнага выдання твораў Івана Шамякіна.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПОГЛЯД У МІНУЛАЕ

Унікальны праект змаглі ўбачыць удзельнікі і госці свята беларускага пісьменства

Адной з галоўных пляцовак падчас святкавання Дня беларускага пісьменства стаў павільён «Адзінства», дзе прадстаўлены аўтарскі праект лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава «17 верасня — Дзень народнага адзінства».

Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

Праект прыцягнуў да сябе ўвагу не толькі жыхароў Капыля і Капыльскага раёна, але і шматлікіх гасцей свята з іншых рэгіёнаў краіны. Кожны з іх змог пагутарыць з Уладзімірам Аляксеевічам і атрымаць вычарпальныя адказы на ўсе пытанні. Напрыклад, Святлана Георгіева прыехала з Брэсцкай вобласці. Яна са школьных гадоў цікавіцца гісторыяй.

— Мне захацелася асабіста дакрануцца да работ знакамітага майстра, — кажа жанчына. — І я вельмі задаволеная, што не пашкадавала выхаднога дня, каб прыехаць на выстаўку.

Аліна Казлова з Баранавіч завітала разам з дачкой і ўнукам-школьнікам.

— Хачу, каб дзіця ведала гісторыю сваіх продкаў, як ім жылося за Польшчай. Бо Баранавічы да 1939 года былі пад уладай Рэчы Паспалітай, — кажа яна.

А паглядзець тут можна было сапраўды шмат цікавага, адкрыць для сябе нешта новае.

Наведвальнікі змаглі ўбачыць асабістыя рэчы дзяржаўнага і палітычнага дзеяча Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Сяргея Прытыцкага, маладомыя шырокаму колу чытачоў арыгінальныя друкаваныя беларускія выданні 1921—1939 гадоў. Тут расказвалася аб жыцці жыхароў Заходняй Беларусі. Цікавасць выклікаюць і фотаздымкі таго перыяду, гістарычныя дакументы, першыя беларускія газеты, што пачалі выпускацца пасля аб'яднання Заходняй Беларусі і БССР.

— Мы прадстаўляем праект разам з вядомым беларускім калекцыянерам Уладзімірам Ліхадзедавым. Праект прысвечаны новаму нацыянальнаму святу, якое будзе адзначацца ў нашай краіне ўпершыню, — расказаў **навуковы супрацоўнік навукова-метадычнага аддзела Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Аляксей ЛЕСІН.** — У нашай экспазіцыі прадстаўлены, па-першае, новыя кнігі Уладзіміра Аляксеевіча. Адна з іх, «17 верасня — Дзень народнага адзінства», толькі што выдадзена і падчас свята прэзентавана аўдыторыі. На выстаўцы таксама можна азнаёміцца з нашай мабільнай экспазіцыяй «17 верасня — Дзень народнага адзінства», якая будзе перададзена ва ўсе абласныя музеі Беларусі і, адпаведна, будзе экспанавацца ва ўсіх кутках нашай краіны. Плануецца таксама, што гэтыя панэлі мабільнай экспазіцыі будуць у свой час прадстаўлены і ва ўсіх раённых цэнтрах. Яны распавядуць пра сэнс гэтага свята, пра тое, якія падзеі адбыліся ў верасні 1939 года.

Сярод унікальных экспанатаў — скураное паліто і камізэлька Сяргея Прытыцкага — маўклівыя сведкі яго работы падчас Народнага сходу ў кастрычніку 1939 года, калі было ўзнята пытанне аб аб'яднанні Заходняй Беларусі з БССР, дзе той выступаў. Пра гэта сведчыць фотаздымак. Тут можна ўбачыць і партрэт Сяргея Восіпавіча, створаны падчас работы сходу.

Частка экспанатаў распавядае пра вядомы факт, калі ў 1936 годзе ў зале пасяджэнняў Віленскага ваяводскага суда Прытыцкі дзёрзка выстраліў у паліцэйскага правакатара, які выдаў яго сяброў-падпольшчыкаў. За шклом вітрыны знаходзіцца кабура ад пісталета Сяргея Восіпавіча, гільза ад кулі, якой ён страляў і якая трапіла ў фрагмент дрэва на падлозе судовай залы.

Таксама можна пагартаць знакаміты гумарыстычны часопіс «Маланка», які жорстка і востра высмейваў недахопы польскай палітыкі, паводзіны акупацыйных улад на беларускіх землях. У знак таго, што ўяўляла з сябе Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, прыводзіцца Канстытуцыя БССР 1919 года.

— 17 верасня ў залах нашага музея на вуліцы Карла Маркса,12 адчыніцца часовая экспазіцыя, прысвечаная Дню народнага адзінства, дзе можна будзе ўбачыць шмат цікавых экспанатаў на дадзеную тэматыку, — рэзюмаваў Аляксей Лесін.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Убачыць і пачуць пісьменніка

Пяццю тэматычнымі павільёнамі падчас Дня беларускага пісьменства быў прадстаўлены фестываль кнігі і прэсы. Гэта «Памяць», «Традыцыі і сучаснасць», «Разам з кнігай мы расцём», «Адзінства», «Слова пісьменніка». Тут адбылася прэзентацыя тэматычных кніг, прайшлі інтэрактыўныя праграмы. У фотазонах усе ахвотныя маглі сфатаграфавацца з калажамі газет 1921—1939 гадоў, набыць выданні.

Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

Алесь БАДАК расказвае аб рабоце павільёна «Слова пісьменніка».

— У нас стэнд называецца «Слова пісьменніка». Тут можна пазнаёміцца з творчасцю сучасных пісьменнікаў, у тым ліку тых, хто падчас свята атрымаў Нацыянальную літаратурную прэмію, — распавёў **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура Алесь БАДАК.** — Мы заўсёды шырока папулярызуем беларускую класіку, бо гэта тое, без чаго не можа быць сучаснай літаратуры, чытача. Так атрымалася, што сёлетні год багаты на імёны юбіляраў: Іван Мележ, Іван Шамякін, Кандрат Крапіва, Максім Багдановіч і іншыя. У нас багатая на імёны Капыльшчына літаратурная. Не ведаю, ці ёсць яшчэ ў Беларусі такі раён, дзе ў розныя гады нарадзілася столькі вядомых пісьменнікаў — Анатоль Астрэйка, Адам Русак, Алесь Адамовіч, Кузьма Чорны, Сцяпан Александровіч. Усяго іх больш за 50. Мы таксама паказалі іх кнігі. Мы заўсёды за тое, каб наш стэнд быў разнастайны, таму што чытач таксама розны і па ўзросце, і па літаратурных сімпатыях. Таму ў нас кнігі як для дзяцей, так і для дарослых, не толькі мастацкая літаратура, але і гістарычная.

На стэндзе таксама творы пісьменнікаў, што прыехалі з розных рэгіёнаў краіны. Калі не памыляюся, іх больш за сто. Аўтары выступалі перад наведвальнікамі, чыталі свае творы, адказвалі на пытанні, раздавалі аўтографы жыхарам Капыля, гасцям і ўдзельнікам свята. А ахвотных займець інскрыпты літаратараў і набыць кнігі было нямала.

Да сёлетняга Дня беларускага пісьменства Міністэрства інфармацыі і прадпрыемства «Белкніга» ажыццявілі новы сучасны праект аўдыёкніг «Чытанка», які быў прэзентаваны ў павільёне «Слова пісьменніка». Адразу відаць, што ён запатрабаваны ў наведвальнікаў. Дарослыя разам з дзецьмі падыходзілі да стэнда, цікавіліся ўбачаным.

Ім тлумачылі, што на экране прадстаўлены творы як сучаснай, так і класічнай беларускай літаратуры, якія можна паслухаць у выкананні вядомых акцёраў, саміх аўтараў. Тут можна было спампаваць мабільны дадатак з дапамогай QR-кода, потым паслухаць кнігу дома, у грамадскім транспарце, падчас адпачынку.

— Сёння гэта модна, запатрабавана ва ўсім свеце. Аўдыякніга шырока распаўсюджана сярод розных узроставых катэгорый, асабліва сярод дзяцей, падлеткаў, моладзі, — кажа Алесь Бадак. — Мы таксама, думаю, будзем гэтаму фармату аддаваць большую ўвагу. У нас ужо выходзяць кніжкі з QR-кодамі, у асноўным дзіцячыя. Іх можна не толькі пагартаць, пачытаць, але і паглядзець відэа з акцёрам, якія чытае тэкст. Або дзіця можа пачытаць пра нацыянальны беларускі касцюм і тут жа паглядзець здымкі, зробленыя фатографамі. У наступным годзе кніг у такім фармаце будзе яшчэ больш. Мы імкліва рухаемся гэтым шляхам. Але, разам з тым, на сённяшні дзень галоўнае для нас — папяровая кніжка, якая павінна быць не толькі цікавая, але і прыгожа аформленая, каб чалавек захацеў узяць яе ў рукі, пагартаць і набыць.

Пакольскі кніжны рынак перанасычаны, знайсці ў ім сваю нішу цяжка, таму даводзіцца думаць пра тое, каб кніга мела прывабны, арыгінальны знешні выгляд.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

«Сустрэчы. Янка Купала» — у Капыльскім краязнаўчым музеі

Адным з прыкметных мерапрыемстваў у праграме XXVIII Дня беларускага пісьменства ў Капылі стала прэзентацыя кнігі Льва Клейнбарта «Сустрэчы. Янка Купала» ў Капыльскім краязнаўчым музеі.

Знаёмства з кнігай, рукапіс якой чакаў выдання доўгія дзесяцігоддзі, супала з супольнай выстаўкай Літаратурнага музея Янкі Купалы і Капыльскага краязнаўчага музея, прысвечанай 145-годдзю з дня нараджэння Льва Максімавіча Клейнбарта, рускага літаратуразнаўца, журналіста, ураджэнца Капыля.

Дырэктар Купалаўскага музея Алена ЛЯШКОВІЧ расказала, як рыхтавалася да выдання кніга, азначыла ролю Л. Клейнбарта ў станаўленні творчай асобы народнага песняра Беларусі. **Вучоны сакратар музея Галіна ВАРОНАВА** *(на фота)* звярнула ўвагу на асобныя старонкі «Сустрэч...». Леў Клейнбарт спрыяў выданню ў Санкт-Пецярбургу кнігі Янкі Купалы «Шляхам жыцця».

На выстаўцы, якая так і называлася — «Сустрэчы» (дарэчы, яна будзе працаваць у Капылі да 30 верасня), можна было пазнаёміцца з многімі цікавымі экспанатамі, у тым ліку і з кнігай Л. Клейнбарта «Маладая Беларусь» (1928). У свой час якраз **дырэктар Капыльскага музея Валянціна ШУРАКОВА** — яна і расказала пра гэта на адкрыцці выстаўкі і прэзентацыі — пазнаёмілася з родзічамі літаратуразнаўца, сустрэлася з імі, пабывала ў Кіеве, дзе адзін са спадчыннікаў перадаў ёй архіў Льва Максімавіча.

Выступіў у музеі і **лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП.** Ён прачытаў «Баладу Льва Клейнбарта (15.10.1875 — 20.11.1950)», дзе ёсць і такія радкі: «З лёдам ламаюцца сцежкі і крыгі, / Глуха трашчаць і паўзуць па Няве. / Зноўку з Купалам гаворыш пра кнігі, / Пра Беларусь маладую. Жывеш / Сонцам, што ў вокны людзям заглянула / І асвяціла душу і жытло. / Помніш, Капыль, шмат гадоў прамінула, / Толькі яго не прапала цяпло...»

Кастусь ЛЕШНІЦА.

• Меркаванне

Што значыць для яго Дзень беларускага пісьменства, расказаў «Звяздзе» старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ:

— Гэтаму дню аддаём асаблівую ўвагу. Перш за ўсё гэта — добрая магчымасць для пісьменнікаў вытрымаць экзамен перад чытачамі, даць справаздачу жыхарам краіны пра тое, што было зроблена, што атрымалася, што не атрымалася, якія праблемы могуць узнікаць. Таму мы заўсёды гэтае свята сустракаем з вялікім жаданнем, хваляваннем і чакаем сустрэч з усімі катэгорыямі грамадзян. У межах Дня беларускага пісьменства ў Капылі арганізавана шмат мерапрыемстваў: круглыя сталы, сустрэчы з людзьмі, прэзентацыя кніг. Гэта адно з найбуйнейшых свят літаратуры, дзе яна паказала, што сапраўды ёсць, мае патрэбу ў тым, каб людзі з ёй знаёміліся, чыталі кнігі. І мы да гэтага імкнёмся.

«ЁСЦЬ УПЭЎНЕНАСЦЬ, ШТО МЫ СУР'ЁЗНА РУШЫМ НАПЕРАД»

Такую ацэнку планам па інтэграцыі напярэдадні сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі 9 верасня даў сустаршыня Асацыяцыі знешнепалітычных даследаванняў імя А. А. Грамыкі, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Сяргей РАХМАНАЎ. Па яго словах, адчуваецца, што інтэграцыя атрымала магутны імпульс. Гэта праяўляецца на найвышэйшым узроўні і ў кантактах экспертаў.

У мультымедыйным прэс-цэнтры Sputnik Беларусь прайшоў круглы стол «Паглыбленне інтэграцыі Беларусі і Расіі: сумесныя палітычныя і эканамічныя рашэнні ў будаўніцтве Саюзнай дзяржавы ва ўмовах санкцый». Эксперты Беларусі і Расіі абмеркавалі эканамічнае, палітычнае і ваеннае супрацоўніцтва краін, яго стан і перспектывы.

Дацэнт кафедры палітычнай тэорыі МДІМА Кірыл КОКТЫШ заяўляе, што Беларусь стала трэцяй краінай пасля Венесуэлы, Ганконга, дзе тэхналогіі «каляровых рэвалюцый» пацярпелі збой. Пры гэтым, па яго словах, паспяховае развіццё беларуска-расійскай інтэграцыі сведчыць пра канцэптуальнае паражэнне «каляровых рэвалюцый».

«Джордж Байдэн ахарактарызаваў Беларусь і выступленне Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі як крайне небяспечнае для ЗША. Маленькая Беларусь ЗША пагражаць не можа. Але (на прыкладзе Беларусі відаць. — **«Зв.»**), што на самай справе ўсе гэтыя тэхналогіі перасталі працаваць, а калі яны даюць збой, страчваецца містыка непераможнасці, арэол прыцягальнасці», — мяркуе Кірыл Коктыш.

Па яго словах, калі спроба рэвалюцыі ў Беларусі пацягне паглыбленне інтэграцыі Беларусі і Расіі, то адбудзецца інстытуалізацыя паражэння Захаду на Усходнееўрапейскім кірунку. А ў глабальным сэнсе гэта азначае правал амерыканскай стратэгіі кантролю Еўропы праз Усходнюю Еўропу, што існаваў з 1991 года.

Эксперт мяркуе, што паражэнне тэхналогій «каляровай рэвалюцыі» пацягне стварэнне новых, якія ўжо не будуць засяроджвацца на ідэалагічнай дыверсіі.

«Я асцерагаўся бы дэстабілізацыі абстаноўкі (пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка казаў у мінулым годзе) з заходняга напрамку, звязанай з вучэннямі НАТА. Такога роду сюжэты могуць пайсці ў ход», — сказаў дацэнт кафедры палітычнай тэорыі МДІМА.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Андрэй РУСАКОВІЧ акцэнтаваў увагу на агульных для Беларусі і Расіі трэндах у абаронным комплексе — мадэрнізацыю і ўзмацненне супрацоўніцтва.

«З 2015—2016-х гадоў абноўлена ваенная дактрына, адбываецца мадэрнізацыя ўзброеных сіл у кантэксце ўдасканалення іх арганізацыйнай структуры і аснашчэння найноўшымі відамі ўзбраення», — падкрэслівае Андрэй Русаковіч.

Ён нагадаў пра сумесныя пасяджэнні калегій міністэрстваў абароны Беларусі і Расіі, што сінхранізуюць дзейнасць узброеных сіл дзвюх краін.

«Важным кампанентам з'яўляюцца вучэнні, шэраг якіх апошнія гады пабольшаў. Вучэнні дэманструюць узроўню сінхранізацыю дзеянняў нашых узброеных сіл, удасканальванне баявой вывучкі ваеннаслужачых, — дадае парламентарый. — Прагназуецца выхад супрацоўніцтва узброеных сіл і абароннай інтэграцыі на новы ўзровень».

Сяргей Рахманаў, у сваю чаргу, заўважае, што нельга казаць пра бяспеку ў адрыве ад інфармацыйнай сферы.

«Мы ўсе разумеем, што ваенныя дзеянні сёння з'яўляюцца гібрыднымі. Мы не можам казаць пра развіццё ўзбраення ў адрыве ад інфармацыйных тэхналогій. Таму наша інфармацыйная бяспека — лагічны бок і абароннай бяспекі. Мы павінны думаць пра іншыя падыходы да абароны, уключаючы праблематыку кібербяспекі, праблематыку падрыхтоўкі кадраў, якія ў стане працаваць у інфармацыйнай сферы», — адзначае Сяргей Рахманаў.

На сустрэчы **загадчык кафедры менеджменту, тэхналогій бізнесу і ўстойлівага развіцця БДТУ, доктар эканамічных навук Ірына НОВІКАВА** казала пра неабходнасць развіваць узаемадзеянне ў высокатэхналагічным сектары эканомікі. «Тут размова ідзе пра супрацоўніцтва не паміж прадпрыемствамі, а паміж кластарнымі ўтварэннямі. Іх ядром з'яўляюцца буйныя даследчыя арганізацыі (універсітэты), што канцэнтруюць увагу на развіцці высокіх тэхналогій, з'яўленні новых высокатэхналагічных прадпрыемстваў», — тлумачыць спецыяліст. Паводле Ірыны Новікавай, БДТУ разам з расійскімі калегамі мяркуюць выпрацаваць метадалогію такой узаемасувязі.

«Неабходна займацца высокатэхналагічнай вытворчасцю. Нашы ўрады павінны заключыць пагадненне аб стварэнні адзінай інавацыйнай прасторы. Навука развіваецца і ў нас, і ў Расіі. Але гэта ўсё ідзе асобна. Так, існуюць адзіныя праграмы ў навуковай сферы, але неабходна інфармацыйная прастора з адзіным фінансаваннем, адзінымі законамі», — выказвае меркаванне доктар эканамічных навук.

Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Сяргей Рахманаў згаджаецца з такім падыходам і дадае, што неабходна мадэрнізаваць вытворчыя галіны, якія існуюць сёння, і ў той жа час развіваць перспектыўныя сферы — мікраэлектроніку, робататэхніку, нафтахімію, прыборабудаўніцтва, біятэхналогіі.

«На ўсіх гэтых кірунках нам неабходна не проста агульнадзяржаўная кааперацыя і каардынацыя, а галіновая кааперацыя і каардынацыя, каб у нас былі агульныя стратэгіі. На іх аснове мы зможам фарміраваць агульную стратэгію эканамічнага, тэхналагічнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця. І гэта задача ўскладваецца на плечы не толькі кіраўніцтва краін, але і экспертаў, якія павінны быць прыцягнуты да гэтай работы», — заяўляе Сяргей Рахманаў.

Марыя ДАДАЛКА.

Надвор'е

ПАХАЛАДАННЕ АДМЯНЯЕЦЦА

З сярэдзіны тыдня да нас вяртаецца «старое» лета

У першы тыдзень восені сапраўднае арктычнае паветра, якое паступіла на тэрыторыю краіны, закінула нас па тэмпературным рэжыме адразу на месяц наперад. Так, за нядзельныя суткі сярэдняя тэмпература паветра склала 6—10 цяпла, што на 4—7 градусаў ніжэй за кліматычную норму і характэрна для першай дэкады кастрычніка. У начныя гадзіны ў нядзелю і панядзелак у паветры і на вышыні 2 сантыметраў ад паверхні глебы назіраліся замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. І сёння ўдзень будзе нягорача, але з 8 верасня да нас зноў прыйдзе хваля ўпэўненага цяпла, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Ужо літаральна з серады надвор'е ў нашай краіне будуць вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску і цёплая паветраная маса, якая распаўсюдзваецца з боку Заходняй Еўропы. Усталюецца цёплае надвор'е. Чакаецца пераменная воблачнасць, без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні слабы з узмацненнем да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 градусаў вышэй за нуль, па поўначы — да 10 цяпла. Удзень будзе ад плюс 18 градусаў да 23 цяпла.

У чацвер і пятніцу нас чакае сапраўды камфортнае надвор'е. Спачатку ў чацвер чакаецца пераменная воблачнасць, без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі будзе туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, заходні слабы з узмацненнем да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы павысіцца і складзе 6—13 градусаў вышэй за нуль, але ў асобных раёнах краіны будзе ад 3 да 5 цяпла. Удзень сонца нагрэе паветра да плюс 19—25 градусаў. На наступны дзень, у пятніцу, будзе наогул «прыпякаць». У гэты дзень чакаецца пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі будзе туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 цяпла, удзень — ад плюс 20 да плюс 26 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, і ў выхадныя на тэрыторыі нашай краіны захаваецца даволі цёплае надвор'е.

Сяргей КУРКАЧ.

Брестский филиал «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона

Предметы торгов	Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	Размер задатка, руб.
Лот № 1: грузовой бортовой тентовый MAZ 6312A8 320 010, год выпуска 2010 г., регистрационный знак АЕ 5093-1	45 219,48	4 521,95
Лот № 2: прицеп бортовой тентовый MAZ 870110 3010, год выпуска 2010 г., регистрационный знак А 0036 В-1	10 887,56	1 088,76

Продавец: ф-л «Автовокзал г. Бреста» ОАО «Брестоблавтотранс», УНП 201026176, тел./факс 80162 29 70 42. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB 30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 08 октября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 07 октября 2021 г. до 17.00

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор аукциона	ИП Колесников Марат Михайлович, тел. +375 (44) 719-44-14, kolesnickov.marat@yandex.ru
Продавец	ИООО ««Диалог-Могилев», УНП 700008764, 212030, г. Могилев, пер. Комиссариатский, дом 10, офис 1

Предмет аукциона

Лот № 1. ЧАСТЬ АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ С ПОДВАЛОМ, расположенная по адресу: 212030, г. Могилев, пер. Комиссариатский, дом 10

Инв. номер	Наименование (назначение)	Общая площадь
700/С-82715	Изолированное помещение	600,0 кв. м

Сведения об административном здании	Объект недвижимого имущества относится к статусу историко-культурных ценностей, здание двухэтажное с подвалом, имеются помещения на 1, 2, в подвале, 4 гаража, коммуникации все центральные
Сведения о земельном участке	Объект недвижимого имущества расположен на земельном участке, предоставленном Продавцу на праве постоянного совместного пользования, общей площадью 0,1096 га
Начальная цена с НДС 20 %	**605 000,00 бел. руб.**
Шаг аукциона	**35 000,00 бел. руб.**
Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется с 9.00 до 17.00 пн.–пт., по предварительному согласованию по тел. +375 (44) 719-44-14, Колесников М.М.

Задаток: 5000 (пять тысяч) белорусских рублей. Перечисляется на р/с BY33PJCB30123000301000000933 в ОАО «Приорбанк», PJCBBY2X. Получатель – ИООО «Диалог-Могилев», УНП 700008764. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ИООО «Диалог-Могилев», проводимом **20 сентября 2021 г.**

Порядок подписания договора купли-продажи и срок оплаты: подписания договора – не позднее 5 рабочих дней после проведения аукциона, срок оплаты – 50 % в течение 30 календ. дней со дня заключения договора, оставшаяся часть согласно условиям договора

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина Республики Беларусь от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица»

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Дата, место и время проведения аукциона	**20 сентября 2021 г. в 12.00 ИООО ««Диалог-Могилев», г. Могилев, пер. Комиссариатский, д. 10, оф. 1**
Дата, место и время окончания приема документов	**17 сентября 2021 г. до 17.00 ИООО «Диалог-Могилев», г. Могилев, пер. Комиссариатский, д. 10, оф. 1**
Контакты для получения информации	**+375 (44) 719-44-14, kolesnickov.marat@yandex.ru**

Разам мы — моцныя

«Дзяржаўная пазіцыя павінна абараняць суверэнітэт краіны»

У Гродне прайшоў рэгіянальны форум «Беларусь адзіная»

На сустрэчу з вядомымі экспертамі і палітолагамі краіны сабраліся прадстаўнікі ідэалагічнага актыву Гродзенскай вобласці, палітычных партый, лідары грамадскіх арганізацый, дэпутаты розных узроўняў, члены маладзёжнага парламента — усе тыя, хто на ўзроўні дзяржавы займаецца пытаннямі ідэалогіі і выхаваннем маладога пакалення.

Фота Мікалая ЛАПІНА.

Форум у Гродне — працяг вялікага агульнанацыянальнага дыялогу, які быў пачаты яшчэ ў мінулым годзе і заклаў асновы новага мадэрнізаванага кансэнсусу, падкрэсліў п**алітычны аглядальнік, старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.** Ён звярнуў увагу на важнасць такіх сустрэч менавіта напярэдадні гістарычнай даты 17 верасня, якая вызначаная Днём народнага адзінства. Раней гэта тэма замоўчвалася, сыходзіла і з грамадскіх дыскусій, і з гістарычнай самасвядомасці беларускага народа, адзначыў журналіст. А між тым гэту дату ў многіх аспектах можна лічыць лёсавызначальнай. Бо адбылося аб'яднанне дзвюх частак краіны ў адзінае цэлае. Сённяшняя сітуацыя вымушае больш грунтоўна падыйсці да пытанняў адзінства краіны.

На форуме казалі пра небяспеку трапіць у залежнасць ад заходніх крэдытораў, якія адной рукой прапануюць крэдыты, другой будуюць інфраструктуру для падрыву дзяржаўнасці. На гэтых момантах засяродзіў увагу **палітолаг, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі Аляксей ДЗЕРМАНТ.**

— Беларусь з 2010 года вызначала сваё месца ў свеце. Мы імкнуліся пабудаваць мост. Для беларусаў уласціва шукаць кампрамісы, магчымасці ўзаемаразумення паміж рознымі культурамі, рэлігіямі, цывілізацыямі і ўзводзіць агульны дом. І беларусы менавіта з гэтых пазіцый будавалі сваю палітыку. Але, на жаль, ёсць інтарэсы вялікіх краін і вялікіх блокаў. І наш гэты мост у 2020 годзе паспрабавалі ўзарваць. Гэта нам вялікі ўрок, — выказаў сваю пазіцыю палітолаг. — Таму варта сітуацыю выпраўляць, у тым ліку і ў сферы ідэалогіі.

На думку **дырэктара інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя» Аляксандра ШПАКОЎСКАГА,** людзям трэба тлумачыць, што санкцыі б'юць не па сярэднім класе. Яны адчувальныя для пенсіянераў, маламаёмных, тых, хто знаходзіцца ў складаных жыццёвых абставінах. У дадзеным выпадку вельмі важна ўважліва ставіцца да гэтых катэгорый. І ўвогуле не дапускаць фармалізму, бюракратычнага і раўнадушнага падыходу з боку кіруючага апарату.

Таксама палітолаг адзначыў, што яго, як члена Канстытуцыйнай камісіі, хвалююць некаторыя аспекты, якія пакуль да канца не вызначаны. Як вядома, праект Канстытуцыі на разгляд ў Прэзідэнта, хутка адбудзецца нарада з удзелам кіраўніка дзяржавы. Але яшчэ ёсць некалькі пытанняў, якія варта абмеркаваць.

Кіраўнік праекта «Грошы і свет» Аляксей АЎДОНІН звярнуў увагу аўдыторыі на новы фармат камунікацый.

— Мэта вялікай размовы — гэта выбудоўванне новай камунікацыі са сваёй аўдыторыяй. Цяпер варта разумець, што ўвесь свет уступіў у эпоху разбурэння дзяржаўнасці. На яе адводзіцца найбліжэйшыя 15 гадоў. А пачаўся гэты працэс у 2019 годзе. Сутнасць такая — разбурыць суверэнітэт і стварыць новыя формы, у тым ліку гарады-мегаполісы. І Беларусь у 2020 годзе якраз апынулася на грэбні гэтай разбуральнай хвалі. Раскачка ідзе па трох кірунках: рэлігія, нацыянальнасць і так званы асабісты кашалёк. Таму трэба мяняць формы і метады кіравання. Гэта не значыць, што трэба казаць, што заўтра ўсё будзе лепш, чым учора. Трэба выпрацаваць новыя механізмы, у тым ліку карыстацца электроннымі інфармацыйнымі формамі, — лічыць Аляксей Аўдонін.

Аб значнасці дыялогу з грамадствам выказаўся **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК.** На яго думку, сёння кожны крок вялікай палітыкі выклікае значны рэзананс у грамадстве. Таму важна, каб дзяржаўная пазіцыя была ўзважаная, рацыянальная і абараняла інтарэсы Беларусі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

«ШКОЛЬНЫ» ШАШЛЫЧОК, ФІЛЕ ПТУШКІ З АНАНАСАМ І «РАЗУМНЫЯ БУФЕТЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Для дзяцей мае значэнне ўсё: як аформлена памяшканне, у якім яны харчуюцца, сервіроўка сталоў, які посуд пры гэтым выкарыстоўваецца, бо яны «ядуць вачыма», і такія нюансы для іх вельмі важныя, — падкрэслівае **загадчык аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА.** — Калі на харчаванне дзяцей у дашкольных установах скаргаў да нас практычна не паступае, то на арганізацыю харчавання ў школах скардзяцца часта.

Што не задавальняе дзяцей, якія адмаўляюцца наведваць школьную сталовую? Па-першае, у новага пакалення змяніліся смакавыя прыхільнасці. Мы лічым, што прыкладныя рацыёны для навучэнцаў павінны распрацоўвацца не на год, а пастаянна пераглядацца і абнаўляцца з улікам і сезонных асаблівасцяў, і густаў школьнікаў. Калі ў меню прысутнічае нейкая страва, якая пастаянна адпраўляецца ў адходы, ніякая агітацыя не дапамагае і дзеці ўпарта яе ігнаруюць, значыць, трэба замяніць. Канешне, мы не можам выканаць усе пажаданні і запыты дзяцей і іх бацькоў — мой унук, напрыклад, просіць мяне дазволіць у школе шаўрму (*смяецца*. — **Аўт.**). Харчаванне павінна быць здаровым, бяспечным і дыетычным. Але і ігнараваць новыя тэндэнцыі ў харчаванні сучасных дзяцей — няправільна!

«Што сёння часцей за ўсё трапляе ў адходы ў школьных сталовых? — разважае Ала Малахава. — Гэта першая страва, трэцяя і хлеб. У сельскай мясцовасці дзеці ядуць першую страву, там гэта традыцыя ў харчаванні захоўваецца, а ў гарадскіх сем'ях ужо даўно адмовіліся ад супоў. Таму зусім неабавязкова ўключаць іх у школьныя рацыёны або можна пакінуць раз ці два на тыдзень, напрыклад, боршч.

Увогуле, рацыёны для сельскіх і гарадскіх школьнікаў не могуць быць аднолькавыя. Заўважана, што гарадскія дзеці таксама не ядуць фармаваны хлеб у «цаглінках». Многія школьнікі не жадаюць піць салодкі чай, бо ў сям'і ад цукру адмовіліся. Таму мы рэкамендуем уключаць у меню не толькі салодкія напіткі. Увогуле, можна проста паставіць цукарніцу на стол, каму хочацца — няхай сам сабе падсалодзіць. У нарматыўных дакументах прапісана, што рацыёны павінны быць аднолькавыя і ў дзяцей, якія харчуюцца за кошт бюджэтных сродкаў, і ў тых, за чыё харчаванне плацяць бацькі. Але ў школах гэты дакумент трактуюць няправільна. У дзяцей абавязкова павінен быць выбар! У Мінску зараз практыкуецца два варыянты меню. Калі дзіця, напрыклад, не есць рыбу дома, то не будзе яе есці і ў школьнай сталовай. Значыць, мы выкідаем грошы на вецер: або дзяржаўныя, або бацькоўскія. Такое нельга дапускаць. Ссабойкі ў школе не забараняюцца, але яны павінны быць з карысных прадуктаў, захоўвацца ў належных умовах, і спажывацца ссабойка павінна не ў класе, а ў сталовай. Задача настаўніка (класнага кіраўніка) — прасачыць, ці харчуецца дзіця ў школе. Бо інтэрвалы паміж прыёмам ежы не павінны перавышаць чатыры гадзіны.

А ўвогуле дзіця павінна на працягу сутак харчавацца чатыры разы. Трэба разумець, што школьнае харчаванне складае ўсяго 20—25 працэнтаў ад сутачнай патрэбы дзіцяці».

Ала Малахава заўважыла, што ёсць сем'і, якія перайшлі на вегетарыянства: «Але сапраўднае вегетарыянства — вельмі дарагое задавальненне, таму што прадукты, якія выключаюцца з рацыёну, трэба паўнацэнна замяняць. А ў нас часцей за ўсё проста адмаўляюцца ад тых ці іншых прадуктаў. Таму і педагогам, і ўрачам-педыятрам неабходна размаўляць і пераконваць бацькоў у тым, што пераводзіць дзяцей на вегетарыянства — недапушчальна. У 18 гадоў няхай яны самі вырашаюць для сябе пытанне, ці падыходзіць гэта ім».

Ала Малахава дадала, што харчаванне павінна адпавядаць нормам па каларыйнасці, наборы бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, адпавядаць узросту і фізічнай актыўнасці. Неабходна, каб яно было разнастайным. Штодня дзіця павінна ўжываць мяса, рыбу, гародніну, садавіну, малако (каля 500 мл у дзень), у тым ліку шклянку кефіру на ноч. Два разы на тыдзень спажываць смятану і творог, а сметанковае масла і алей павінны быць у рацыёне дзіцяці кожны дзень.

Арганізацыяй харчавання ў сталічных установах дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі займаецца Камбінат школьнага харчавання, а ў дашкольных — цэнтры па забеспячэнні дзейнасці ўпраўленняў па адукацыі дзевяці адміністрацыйных раёнаў Мінска.

У Мінску гарачым харчаваннем ахоплена каля 94 працэнтаў школьнікаў, а бясплатнае харчаванне атрымліваюць каля 55 працэнтаў ад агульнай колькасці навучэнцаў. Як сцвярджае **начальнік аддзела па арганізацыі харчавання Нацыянальнага інстытута адукацыі Люцыя МІХАЛЬЧУК**, школьнае харчаванне не з'яўляецца абавязковым і пісаць пісьмовую адмову ад яго не патрабуецца. Але бацькам варта задумацца над тым, што толькі бутэрбродамі харчавацца няправільна.

Дарэчы, у новым вучэбным годзе ў харчаванні мінскіх школьнікаў з'явіцца шэраг навінак, якія павінны спадабацца дзецям.

«За летні перыяд мы распрацавалі новае меню на вучэбны год, якое прайшло гігіенічную ацэнку ў Мінскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, — паведаміла **дырэктар Камбіната школьнага харчавання горада Мінска Надзея ЛУКАШЭВІЧ.** — З гэтага года ўзялі на сябе абавязацельства — абнаўляць школьнае меню кожную чвэрць, улічваць сезоннасць і перавагі дзяцей і бацькоў, каб ахоп школьным харчаваннем быў як мага большым. Так, у меню ўключаны як новыя стравы, так і класічныя, якія дзеці любяць. Ролы мы з яго выключылі, а шашлычок «Школьны», які вельмі падабаецца ўсім, уключылі ў восеньскае меню. У ліку навінак — філе курынае «Смачнае», запечанае пад сырнай-смятаннай масай, біточкі «Далікатныя», прыгатаваныя з мякаці сцягна кураня. Спадабаецца дзецям таксама філе птушкі, запечанае з ананасам.

З новых салатаў — «Рамонак» са свежага агурка з яйкам і цукровай кукурузай з раслінным алеем. А салата «Аліўе» ў школьным меню сёлета будзе ісці з дадаткам «новая» ў назве, таму што мы выключылі ў складзе цыбулю, якая не падабалася дзецям. У гэтым годзе для запраўкі і прыгатавання страў будзем працаваць на рапсавым алеі айчыннай вытворчасці, а ў якасці эксперымента ў дзіцячыя сняданкі ўключаем перапёлчыны яйкі.

Надзея Лукашэвіч заўважыла, што на сайце камбіната ёсць поўная інфармацыя аб прыкладных меню. І кожны з бацькоў можа паглядзець, што будзе ў дзіцяці ў гэты дзень ці на бягучым тыдні.

Дырэктар Камбіната школьнага харчавання таксама нагадала, што з верасня ў школах Мінска ўкараняецца праект «Разумны буфет». Купіць ежу дзеці ў ім змогуць па безнаяўным разліку праз асабісты QR-код.

— Гэты праект накіраваны на тое, каб выключыць наяўныя плацяжы і паскорыць абслугоўванне дзяцей у буфетах падчас перамены, — распавяла яна. — Акрамя таго, з'явіцца элемент празрыстасці. Усё, што купіць дзіця ў «разумным буфеце», выкарыстоўваючы QR-код, які яму прысвояць бацькі, яны змогуць убачыць у справаздачы ў дадатку. Дарослыя могуць выставіць абмежаванні па суме грошай альбо адзначаць у спецыяльным дадатку, якія стравы дзіцяці можна купляць, а ад якіх варта ўстрымацца. Гэта опцыя асабліва карысная, калі ў школьніка ёсць індывідуальныя абмежаванні, якія патрабуюць выключыць з харчавання пэўныя прадукты.

Упершыню «разумныя буфеты» былі апрабаваныя ў Партызанскім раёне Мінска летась. Яны атрымалі высокую ацэнку вучняў, бацькоў і настаўнікаў. У верасні такія буфеты адкрыліся ўжо ў ста сталічных школах, а да канца вучэбнага года плануецца ахапіць усе навучальныя ўстановы.

Што датычыцца школьных буфетаў, то, як заўважыла Ала Малахава, «яны не павінны пераўтварацца ў краму». Некалькі гадоў таму санітарная служба ўводзіла абмежаванні на рэалізацыю там кандытарскіх вырабаў і розных ласункаў.

— У буфеце могуць рэалізоўвацца салаты, садавіна, сокі, кісламалочныя прадукты. Калі дзецям прапануецца шакалад, то гэта павінен быць шакалад аднаго віду, напрыклад, «Любімая Алёнка», а не дзесяць гатункаў розных вытворцаў, — падкрэсліла спецыяліст. — Мы не абмяжоўваем выпечку ўласнай вытворчасці, пры прыгатаванні якой выкарыстоўваецца сметанковае масла і не дапускаецца выкарыстанне маргарыну ці харчовых дабавак. Вельмі прыемна бачыць у школьных буфетах уласныя піражкі з капустай, яблыкамі, курагой — тое, што карыснае дзецям.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Паліва для аўто, гарачы хлеб і цішыня, якая гамоніць

Узнагароды «звяздоўскім» лаўрэатам

Толькі што падчас Дня беларускага пісьменства ў Капылі адбылося ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі за найлепшыя кнігі, якія выйшлі ў 2020 годзе. Да вялікага свята беларускага слова «Звязда» прымеркавала і ўзнагароджанне лаўрэатаў свайго традыцыйнага конкурсу апавяданняў.

З-за эпідэмічнай сітуацыі ўзнагароджанне давялося правесці анлайн — тым больш некаторыя з лаўрэатаў жывуць далёка ад Мінска. Але кожны атрымае па пошце прыемныя падарункі і дыпломы.

Давайце нагадаем творы, якія сталі лаўрэатамі «Звязды» за 2020 год.

Крысціна Курчанкова «Калі цішыня загамоніць»

Містычна-сюрэалістычная атмасфера старой хаты заварожыць і змусіць разгадаць сюжэт:

«Упаў яблык за акном. Другі. А можа, нехта нябачны колеру зорнага неба зазірае ў прысцеплыя брудныя шыбы? І павольна абыходзіць хату на дыбачках... на яблыках.

Завібравала злёгку падлога ад цяжкіх крокаў — навязаны непадалёк суседскі конь перастуліў капытамі, бразнуў ланцугом. Суседскі?! А ці быў у суседа конь?..

Паклікала некага няясыць — і з-за далёкай ракі кугыкнуў, адгукнуўся ёй начны запознены цягнік.

У шафе заварушыліся. Тоненька піскнулі на два галасы.

Хочацца слухаць яшчэ, але шматгалосая цішыня мерна дыхае і сапе, скруціўшыся клубком наўпрост наўколенках... Цёплая і жывая».

Мая Галіцкая «Выжыў»

Апавяданне Маі Галіцкай пра афганскую вайну, якая пакінула трагічную памяць і на беларускай зямлі.

«Змяя таўшчынёю ў руку дужага мужчыны ляжала на голых рудых каменнях, зацярушаных пластам попелу, пяску і нагару. Чарнёным срэбрам адлівала спіна, расцярушаная кіпцюрамі драпежніка. Кропелькі пунсовай крыві сцякалі на каменне і тут жа запякаліся на пяцідзесяцігрануснай спякоце. Скіраваныя ў адну кропку шкляныя вочы яе цьмянелі, і здавалася, што апошнія сілы выцякалі з яе разам з гэтымі кроплямі. Лёшка стаяў нерухома, скамянеўшы ад жаху і жалю, якія яго раздзіралі, але ўсё ж такі жаль адолеў, і ён, выставіўшы аўтамат, павольна пайшоў да змяі, прыгаворваючы:

— Добрая... Не палохайся... Не кусай...»

Віктар Варанец «Гарачы хлеб»

Назва, здавалася б, простая, але гістарычны дэтэктыў надзвычай пакручасты:

«Ірына блукала па шматлікіх пакоях вялізнага палаца, нервова пазіраючы на гадзіннікі, што стаялі на падлозе, століках, віселі на сценах. Ужо дзве гадзіны, як Фелікс, яе каханы муж, павінен быць дома. На вуліцы добра сцямнела, там-сям чуліся стрэлы, крыкі, рэзкія каманды. Восенню 1917 года ў Петраградзе было неспакойна, і таму Ірына не знаходзіла сабе месца. Але вось заблямкаў званочак на ўваходзе, пачуліся крокі пакаёўкі, і праз хвіліну ў пакой увайшоў высокі, хударлявы, з іканапісным тварам візантыйскага пісьма мужчына».

Міхась Пазнякоў «Вяртанне з фронту»

У год, калі святкаваўся юбілей Перамогі, асабліва актуальна было з дапамогай мастацкага слова перанесціся ў тыя часы:

«Салдат быццам знерухомеў і страціў мову. Ён стаяў пасярод хаты і моўчкі плакаў. З яго вачэй каціліся, ліліся па нябрытых шчоках буйныя слёзы. Рукі салдата, працягнутыя наперад, застылі без руху. Яго вусны дрыжэлі, і ён нічога не мог вымавіць. Нарэшце ціха, а Вальцы падалося, што гучна, прамовіў:

— Дзеткі, я ваш тата...»

* * *

Спадзяюся, вы ацанілі стыль лаўрэатаў і зацікавіліся іх творамі, якія заўсёды можаце прачытаць цалкам па спасылцы на нашым сайце.

А мы нагадваем, што «звяздоўскі» конкурс працягваецца. Курыруе яго ранейшаму **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», вядомы паэт, пісьменнік, перакладчык Алесь БАДАК.** Ён адзначае:

— На сённяшні дзень «звяздоўскі» конкурс апавяданняў — гэта найлепшая стартавая пляцоўка для тых, хто толькі спрабуе свае сілы ў прозе, паколькі чытач газеты вельмі разнастайны і па ўзросце, і па сваім сацыяльным статусе. Чаго яшчэ жадаць пісьменніку? Кнігу паспрабуй данясі да чытача. А газету сёння вечарам надрукавалі — заўтра яна ўжо ў паштовай скрынцы падпісчыка. Мне здаецца, з гэтай прычыны ў рэдакцыйнай пошце часта можна сустрэць апавяданні і вопытных празаікаў. Але сам па сабе літаратурны вопыт яшчэ не зарука перамогі ў конкурсе. Пагартайце кнігі нашых класікаў: некаторыя іх творы, што з часам сталі хрэстаматыйнымі, былі напісаны ў той час, калі самі аўтары яшчэ не былі вядомыя шырокаму чытачу. Гаворка і пра Янку Брыля, і пра Міхася Стральцова, і пра іншых нашых знакамітых празаікаў. Таму, хто ведае, можа, нешта з таго, што сёння друкуецца на старонках «Звязды», праз некалькі дзесяцігоддзяў увойдзе ў школьныя хрэстаматыі.

Яшчэ раз віншуем нашых пераможцаў! І чакаем вашых новых твораў, шаноўныя чытачы, бо чарговы конкурс ужо ідзе! Пішыце: у электронным выглядзе на пошту: info@zviazda.by альбо на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013. Пазначце на лісце «На літаратурны конкурс» і дадайце зваротныя тэлефон і поўныя пашпартныя даныя — нумар, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар). Творы мусяць быць на беларускай мове, якія раней нідзе не друкаваліся, аб'ёмам да 10—12 тысяч знакаў. Разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Афіша

І ПЕНСІЯНЕРАЎ ЛЯЛЕЧНІКІ ЧАКАЮЦЬ

Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Беларускі тэатр «Лялька» пачне трыццаць шосты тэатральны сезон 19 верасня

Фрагменты спектакля «Лялькі Ціма Талера, або Прададзены смех».

Асаблівасць гэтага добра вядомага далёка за межамі нашай краіны віцебскага тэатра ў тым, што ў яго рэпертуары спектаклі — не толькі для дзяцей, падлеткаў, але і для дарослых. Прыезджым тутэйшыя абавязкова раяць наведаць «Ляльку». І моўны бар'ер (усе пастаноўкі на беларускай) не перашкода для іншаземцаў. Мова лялек, дзякуючы таленавітым артыстам, хутка становіцца зразумелай усім, незалежна ад краіны пражывання.

Традыцыйна і ў першы афіцыйны дзень новага творчага года будзе што паглядзець, як кажуць, і малым, і старым. Тым, хто 19 верасня наведае тэатр, лялечнікі падрыхтуюць сюрпрызы, якія пакажуць і па-за глядзельнай залай. Адбудзецца «Восеньскі баль для дзяцей» з удзелам артыстаў тэатра перад спектаклем «Папялушка», які пачнецца а адзінаццатай гадзіне раніцы. Дарослых запросяць на танцавальную вечарыну, перад тым як у шэсць гадзін вечара пачнуць паказваць «Спакусу» паводле аповесці А. Чэхава «Чорны манах». Цікава, што сярод шасці пастановак для дарослых — «Дэкамерон» (імправізацыя на тэмы Джавані Бакача). А яшчэ — «Ладзя роспачы» (па творы Уладзіміра Караткевіча), «Нататкі вар'ята» (па аповесці Мікалая Гогаля) і іншыя.

У канцы кастрычніка або ў пачатку лістапада плануюць адсвяткаваць 75-ю гадавіну з дня нараджэння Віктара Ігнатавіча Клімчука, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, нязменнага мастацкага кіраўніка тэатра. Ён быў адным з заснавальнікаў і першым рэжысёрам лялечнай трупы, якую ў 1985 годзе стварылі пры Беларускім дзяржаўным драмтэатры імя Якуба Коласа. А 20 красавіка 1986 года адбылася першая прэм'ера калектыву — спектакль «Дзед і Жораў» па творы Віталя Вольскага. Гэты дзень лічыцца днём нараджэння «Беларускага тэатра «Лялька».

Віктар Клімчук вельмі паважліва адносіцца да беларускай драматургіі, многае зрабіў для таго, каб ужо некалькі пакаленняў гледачоў шанавалі беларускую мову, нацыянальнае мастацтва. Ён ставіць спектаклі не толькі ў Беларусі, атрымлівае запрашэнні быць членам журы міжнародных лялечных фестываляў. Яго спектаклі шмат разоў прызнаваліся лаўрэатамі.

У канцы верасня, дарэчы, віцебскія лялечнікі паедуць на міжнародны фестываль «Белгародская забава» (Расія). Пакажуць спектакль «Лялькі Ціма Талера, або Прададзены смех», які паставіў сын мастацкага кіраўніка «Лялькі» Міхась Клімчук. Гэты ж малады рэжысёр нядаўна паставіў спектакль «Пятрушка» (народную камедыю на адну дзею), яе ўбачаць гледачы ў верасні. А ў лютым 2022 года плануе паказаць прэм'еру «Чарамара» паводле твора эстонскай пісьменніцы Айно Первік.

Тэатр «Лялька» і навакаллі, пачынаючы з 2014 года, — «сталіца» праекта «Лялечны квартал». Гэта — фэст тэатраў лялек, які штогод праводзяць у ліпені падчас Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Гараджане і турысты там маюць магчымасць пабачыць спектаклі для дзяцей і дарослых на сцэне «Лялькі», а таксама разнастайныя вулічныя пастаноўкі і перформансы. Да ўдзелу ў фестывалі запрашаюцца найцікавейшыя калектывы з краін блізкага і далёкага замежжа, здатныя спалучаць традыцыі з плённымі пошукамі ў рэчышчы сучаснага мастацтва.

Сёлета ў «Лялечным квартале» прынялі ўдзел трупы з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Пензы, Пскова і Арэнбурга. Практычна ўсе мерапрыемствы прайшлі з аншлагам. А па-іншаму ў «Ляльцы» і не бывае. Напрыклад, сёлета прыйшлося двойчы паказваць акцёрскі капуснік у гонар 35-й гадавіны тэатра, бо ўсе ахвотныя трапіць у залу не змаглі падчас запланаванага аднаго паказу. Усяго ў мінулым тэатральным сезоне віцебскія лялечнікі сыгралі каля 360 спектакляў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.

ФУНДУК ПА-БЕЛАРУСКУ

Пацікавіліся, калі ў продаж паступяць арэхі айчыннай селекцыі

Каля вытокаў стварэння беларускіх сартоў фундуку стаяла выдатны навуковец-селекцыянер, прафесар Зоя Аркадзеўна КАЗЛОЎСКАЯ.

Вырошчваць фундук беларускай селекцыі фермеры і аграпрамысловыя прадпрыемствы пачнуць ужо праз некалькі гадоў. Навукоўцы сцвярджаюць, што беларускія сарты фундуку не саступаюць па смаку ўкраінскім і каўказскім, але ў нашых кліматычных умовах будуць даваць большы ўраджай. Мы вырашылі высветліць, калі на прылаўках з'явяцца беларускія арэхі і чаму менавіта фундук у прыярытэце ў селекцыянераў.

Цікавасцю да незвычайных для Беларусі культур і іх паспяховым вырошчваннем у нашым клімаце сёння нікога не здзівіш. Кавуны, напрыклад, ужо вырошчваюць на дачных і прысядзібных участках і нават у прамысловых маштабах. Па смаку і памерах яны не саступаюць імпартным. Мяняюцца кліматычныя ўмовы, кажуць навукоўцы. А значыць, і выбар культур у садаводаў-агароднікаў становіцца большы.

Дзікая ляшчына і яе культурныя «браты»

Уласна кажучы, фундук нельга назваць незвычайнай для Беларусі культурай — ляшчыну можна сустрэць і ў лясах, і на прысядзібных участках. Але дзікая форма — гэта нерэгулярнае плоданашэнне, непрадказальнасць атрымання ўраджаю, а памер арэха далёка не ўражвае, распавяла **старшы навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» Марына БАРЫСЕНКА.** Дзікая ляшчына багата пладаносіць у сярэднім раз на 5-10 гадоў, сарты ж павінны даваць ураджай штогод.

— Культурныя сарты маюць гарантаваныя якасці плода, дакладныя тэрміны ўступлення ў плоданашэнне і паспявання. Пры правільнай агратэхніцы яны даюць гарантаваны ўраджай.

Фундук і ляшчына, дарэчы, — гэта не зусім адно і тое ж.

— Гістарычна склалася так, што сарты ляснога арэха называюць фундуком, а дзікая форма — гэта ляшчына, — тлумачыць суразмоўніца. — А наогул само слова «фундук» — гэта гандлёвая назва пладоў такога арэха. На латыні і дзікія формы дадзенай расліны, і культурныя называюцца аднолькава: Corylus.

Традыцыйна фундук вырошчваюць у Заходняй Еўропе, на Каўказе, ва Украіне. Як любы арэх, ён досыць цеплалюбівы — яму камфортна ў Італіі, Грузіі, Азербайджане. Айчынным фермерам палюбіліся холадаўстойлівыя сарты расійскай селекцыі — Кацярына, Маскоўскі рубін, Тамбоўскі ранні. Першы прамысловы арэхавы сад (ён займае 75 га і быў закладзены ў 2017 годзе ў Маладзечанскім раёне) — гэта ў асноўным сарты еўрапейскай селекцыі.

— Цікавасць да вырошчвання арэхаў у Беларусі была даўно, — кажа Марына Мікалаеўна. — Напрыклад, у нас на эксперыментальных участках вакол інстытута ёсць пасадкі адборных формаў ляшчыны яшчэ 1960-х гадоў.

Але да нядаўняга часу з боку навукоўцаў цікавасць была хутчэй тэарэтычная, а ў садаводаў і фермераў — на аматарскім узроўні: больш для душы, чым у разліку на багаты ўраджай.

— Змена клімату адкрыла новыя перспектывы і падштурхнула да таго, каб сур'ёзна заняцца гэтай культурай: сталі лепш перазімоўваць культурныя формы фундуку замежнай селекцыі, — распавяла спецыяліст.

Аб інтуіцыі селекцыянера і навуковым гонары

Каля вытокаў стварэння беларускіх сартоў фундуку стаяла выдатная навуковец-селекцыянер, вядомая ў нашай краіне і за яе межамі, — доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Зоя Аркадзеўна Казлоўская.

Менавіта яна «зрабіла рэкламу» самой ідэі вырошчвання досыць цеплалюбівага арэха ў прамысловых маштабах у нашых глебава-кліматычных умовах. Плён яе таленту — два беларускія сарты, якія ўжо з 2021 года ўключаны ў Дзяржаўны рэестр сартоў, дапушчаных да вырошчвання на тэрыторыі Беларусі.

— Атрыманне новага сорту залежыць у першую чаргу ад інтуіцыі супрацоўніка і ад напрацаванага шматгадовага вопыту па аналізе зыходнага матэрыялу. Высокая агратэхніка, вядома, важная, але не менш важны «нюх» вучонага, які бачыць патэнцыял тых або іншых узораў.

Адзін з асноўных спажыўцоў фундуку — кандытарская прамысловасць.

Два беларускія сарты фундуку, створаныя пад кіраўніцтвам прафесара Зоі Казлоўскай, называюцца Лал і Яшма. Лал — чырваналіста высокаўраджайны сорт, які рана ўступае ў плоданашэнне. У Яшмы лісце зялёнае, адсюль і назва. Абодва сарты даюць вельмі буйныя арэхі: адным з крытэрыяў для стваральнікаў сорту была максімальная запоўненасць шкарлупіны арэха ядром. Яшчэ адным крытэрыем адбору ўзораў быў смак — салодкі, яскравы і без гарчынкі, якая часта ўласцівая фундуку.

— А дзе можна паспытаць беларускія сарты фундуку?

— Паколькі селекцыйны працэс бесперапынны, практычна ўвесь ураджай з доследнага ўчастка мы высяваем для стварэння новага гібрыднага фонду. Дэгустацыі, вядома, бываюць, але пакуль толькі для супрацоўнікаў інстытута, з мэтай ацаніць смакавыя якасці сорту, — тлумачыць Марына Барысенка. — Так што прыйдзецца паверыць нам на слова: беларускі фундук — хрусткі, буйны, смачны і сыры, і смажаны. Праз некалькі гадоў у спажыўца з'явіцца магчымасць пераканацца ў тым, ці так гэта. Мы стараемся, каб ураджай сартоў Лал і Яшма як мага хутчэй трапіў на сталы беларусаў.

— Гэты год быў даволі складаны для фундуку — зіма выпрабоўвала расліны «на трываласць» сур'ёзнымі маразамі, і вельмі многія сарты ляснога арэха ў нашым калекцыйным садзе не надта добра перанеслі яе, — адзначае Марына Мікалаеўна. — Дарэчы, у нашай калекцыі каля 150 узораў фундуку. Гэтая зіма паказала, якія сарты здольныя вытрымліваць максімальныя нагрузкі. Сярод іх — Лал і Яшма. Сёлета яны далі цудоўны ўраджай.

Ужо сёння, кажа спецыяліст, да новых беларускіх сартоў высокая цікавасць і ў фермераў, і ў дачнікаў, і ў прадстаўнікоў аграпрамыслова комплексу. Але каб сарты дайшлі да спажыўца, спатрэбіцца яшчэ некалькі гадоў. Зараз вядуцца навуковыя даследаванні, накіраваныя на пошук аптымальнага спосабу размнажэння новых сартоў, каб задаволіць попыт на пасадачны матэрыял.

— Цяпер прынятая паскораная селекцыйная ацэнка, — распавялі ў аддзеле селекцыі пладовых культур. — Калі раней на стварэнне новага сорту патрабавалася 30-40 гадоў, то сёння дастаткова 6-10 гадоў.

Сёлета выдатнага вучонага Зоі Казлоўскай не стала. Але работа над стварэннем новых айчынных сартоў фундуку працягваецца, кажуць селекцыянеры.

— Калі ў дзяржрэестр ўнесены сарты (расійскай, украінскай і заходнееўрапейскай селекцыі), рэкамендаваныя да вырошчвання ў Беларусі, навошта ствараць уласныя? Гэта навуковы гонар, ці ёсць больш прагматычныя прычыны?

— І тое, і другое. Зразумела, у сваёй краіне мы можам і павінны стварыць уласны асартымент фундуку. І гэтая работа будзе працягнута. Акрамя таго, у нашых глебава-кліматычных умовах айчынныя сарты паказваюць лепшыя вынікі ў параўнанні з замежнымі, якія сёння вырошчваюць фермеры, — адзначае Марына Барысенка.

З прагматычнага пункту гледжання

Кожны год Беларусь імпартуе каля 600 тон ядраў фундуку. Асноўныя краіны — вытворцы гэтага арэха — Азербайджан, Грузія, Турцыя, а спажыўцы — кандытарская прамысловасць і рознічны гандаль. Каштуе кілаграм фундуку для спажыўца каля 35 рублёў у ядрах і ў сярэднім 15 рублёў у шкарлупіне. Кошт кілаграма неачышчанага арэха супастаўны з коштам садженца. Але з куста, калі сорт зімаўстойлівы і адаптаваны да нашых умоў надвор'я, нават пры самым звычайным доглядзе можна атрымліваць 5-10 кілаграмаў арэхаў. Жыве і пладаносіць фундук мінімум 30-40 гадоў, пры добрым доглядзе — каля 70 гадоў і больш, а ўраджаі даюць значна вышэйшыя за сярэднія. У плоданашэнне ж маладыя дрэўцы (спецыялісты рэкамендуюць рабіць штамбавае фармаванне дрэвам, а не кустом) уступаюць на трэці-пяты год. Падлічана, што ў прамысловых маштабах з аднаго гектара плантацыі фундуку можна атрымліваць ураджай на суму каля 10 тысяч долараў.

Яшчэ адзін аргумент на карысць закладкі арэхавых плантацый — пашырэнне асартыменту для пакупніка. Напрыклад, акрамя традыцыйных сырых і смажаных арэшкаў, на прылаўках могуць з'явіцца арэхі так званай малочнай спеласці — неверагодна карысны для здароўя прадукт, які немагчыма транспартаваць на далёкія адлегласці (захоўваецца ён не больш за чатыры дні). Гэты прадукт медыкі рэкамендуюць пры захворваннях сэрца і сасудаў, цукровым дыябеце, многіх іншых хваробах. Але паспрабаваць яго можна толькі паблізу ад арэхавага саду.

Дзіяна РОНІНА.

Добрая навіна

Стартуюць восеньскія кірмашы

Першы ў гэтым восеньскім сезоне агульнагарадскі сельскагаспадарчы кірмаш пройдзе ў Мінску 18 верасня.

Дакладныя адрасы вызначыць Мінгарвыканкам, прычым яны будуць падзеленыя па двух напрамках: гандлёвыя пляцоўкі па горадзе, у тым ліку буйныя, а таксама пункты ў дварах, каб можна было прадаваць прадукцыю проста з машын.

На кірмашах, у якіх удзельнічаюць як буйныя вытворцы, так і фермерскія гаспадаркі, гаспадары сотак на прыватных падворках, традыцыйна можна будзе зрабіць запас на зіму — паўнавартасны вітамінны набор: сезонную гародніну, бульбу, зеляніну, арэхі, мядовую прадукцыю, а таксама купіць рыбу, мяса, бакалейныя і кандытарскія вырабы. Будуць прадстаўлены і нехарчовыя тавары.

Пакуль жа гандаль сталіцы рыхтуецца абслугоўваць адпачывальнікаў падчас святкавання Дня горада 10—12 верасня. Усе тры дні кірмаш будзе працаваць каля Палаца спорту. Таксама вялікія гандлёвыя рады разгорнуцца ў Верхнім горадзе, па вул. Янкі Купалы і на іншых пляцоўках.

Традыцыйныя восеньскія сельскагаспадарчыя кірмашы пройдуць і ў іншых гарадах краіны.

Розныя — роўныя

Пляцоўка для асаблівых...

У Магілёве прайшоў фестываль творчасці інвалідаў «Разам мы зможам больш!»

У фестывалі прыняло ўдзел каля 130 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі з Магілёва, Бабруйска, Магілёўскага, Бабруйскага, Горацкага, Глускага, Дрыбінскага, Клічаўскага, Крычаўскага і Слаўгарадскага раёнаў. На працягу дня артысты з парушэннямі слыху, зроку і іншымі асаблівасцямі дэманстравалі свае таленты на сцэне Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы. У фае ўстановы працавала выстаўка дэкаратыўна-прыкладных работ майстроў з інваліднасцю.

У фестывалю ёсць свае нюансы. Яго прыхільнікі ўжо ведаюць, што калі на сцэну выходзяць выканаўцы грамадскай арганізацыі «Беларускага таварыства глухіх», лепш перабрацца на галёрку — гук проста аглушальны. Але глядзець на выступоўцаў вельмі цікава. У іх гаворыць усё: вочы, твары, рукі. Наогул, творчасць асаблівых людзей заўсёды больш эмацыянальная і кранальная. Нездарма кажуць, што, калі Бог нешта забірае, ён кампенсуе чымсьці іншым. Фестываль «Разам мы зможам больш!» дазваляе ўбачыць гэтае «іншае» і яшчэ лепш зразумець сусвет людзей.

— Назва фестывалю «Разам мы зможам больш!» і вызначае яго значнасць, — звяртае ўвагу **начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Алег СТЭЛЬМАШОК.** — Яго задача ў першую чаргу — даць роўныя магчымасці для ўсіх нашых грамадзян. Фестываль мае вялікі патэнцыял, я спадзяюся, што да яго будзе далучацца ўсё болей і болей таленавітых людзей.

На фестываль прыехала цэлая каманда ад Бабруйскай гарадской арганізацыі інвалідаў на чале з яе **кіраўніком Таццянай ПУКАЛА** *(на фота)*.

— Я працую нядаўна і ўпершыню на гэтым фестывалі, але ён мне ўжо падабаецца, — усміхаецца яна. — У нас ёсць свая зорачка — вакалістка Святлана Атаханава, якая заняла адно з прызавых месцаў на «Славянскім базары».

На выстаўцы можна было ўбачыць вышытыя іконы 51-гадовай бабруйчанкі Ірыны Юшкевіч. Яна адна з актыўных наведвальніц гуртка, якіх пры арганізацыі — на любы густ. «Яе іконы мы асвячаем у храме», — звяртае ўвагу Таццяна Пукала і запрашае паглядзець на стыльны скураны куфэрак яшчэ адной сваёй падапечнай. Аўтар — інвалід другой групы Таццяна Нікіціна. За аснову яна ўзяла звычайную скрыню з-пад абутку. У руках майстра тая змянілася да непазнавальнасці.

— А яшчэ Таццяна шые экалагічныя сумкі, — заўважае суразмоўніца. — Іх усе да адной раскупілі на «Славянскім базары». А вось паглядзіце, якія цудоўныя ў яе атрымліваюцца вясельныя ўпрыгожванні з келіхаў. Праз сацсеткі іх ужо купілялі на вясельныя сталы. Гэта ідэя не з інтэрнэту — жанчына наогул не карыстаецца ім. Гэта — яе фантазія. Калі пойдуць заказы, зробім з яе індывідуальнага прадпрымальніка.

Сёлета ў Бабруйскую гарадскую арганізацыю інвалідаў прыйшлі навічкі з ліку моладзі, што натхніла кіраўніцтва стварыць інклюзіўны клуб.

— Гэта будзе нешта накшталт утульнай кавярні, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі змогуць абменьвацца думкамі, — кажа Таццяна. — Кавярня будзе знаходзіцца ў бабруйскім Палацы мастацтваў, бо гэтую ініцыятыву мы рэалізуем у партнёрстве з імі. Будзем рыхтаваць розныя забаўляльныя праграмы. Плануецца ўвесці «хуткія спатканні». Насамрэч людзям з інваліднасцю цяжка пазнаёміцца, здаровыя мужчыны і жанчыны не заўсёды прымаюць нас у сваю кампанію.

Старшыня праўлення Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання Беларускага таварыства інвалідаў Алеся ЦУМАРАВА некалькі гадоў таму перамагла ў краіне з сацыяльным праектам і стварыла ў Магілёве пляцоўку пад назвай «Тэрыторыя людзей». Тут свае магчымасці могуць развіваць людзі з абмежаванымі магчымасцямі з усёй вобласці.

— Наш цэнтр узняўся на новы ўзровень, — дзеліцца яна поспехамі. — У нас з'явілася месца, дзе можна выпіць кавы, травяной гарбаты. Мы супраць пластыкавага посуду, таму напіткі падаём выключна ў папяровых кубачках. Яшчэ мы пачалі вязаць адзенне для жывёл. А нядаўна падпісалі дагавор супрацоўніцтва з «Магілёўліфтмашам», будзем рабіць для іх сувенірную прадукцыю.

Карціны, іконы, адзенне, біжутэрыя, вышыўка, вырабы з цеста — выстаўка атрымалася вельмі насычаная, што яшчэ раз даказвае: творчасць асаблівых людзей не мае межаў.

— У фестывалі прымалі ўдзел работы майстроў 10 раённых арганізацый, — адзначыла Алеся Цумарава. — Клічаўская майстрыха, напрыклад, зрабіла свае работы ў моднай зараз тэхніцы поп-арт. І такіх свежых ідэй шмат. Нягледзячы на ўсе складанасці гэтага і папярэдняга года, мы працягвалі развівацца і творча расці.

А вось Раман Казлоў — дызайнер. На выстаўцы можна было ўбачыць створанае ім адзенне ў беларускім стылі з выкарыстаннем ільну. Малады чалавек мае праблемы са слыхам. Вучыўся ў магілёўскім эканамічным каледжы, працаваў на аршанскім прадпрыемстве «Нітка». Зараз развівае свае здольнасці па шыцці. Летась ён заняў трэцяе месца ў рэспубліканскім этапе конкурсу WorldSkills у адпаведнай катэгорыі.

А колькі яркіх нумароў прадэманстравалі майстры сцэны! У складзе народнага фальклорнага калектыву «Квецень» Бабруйскага прадпрыемства «Святлопрыбор» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку ў Магілёў прыехалі 16 чалавек. У нацыянальных строях, задзірыстыя, пявучыя, яны звярталі на сябе ўвагу непасрэднасцю і мовай. На конкурсе яны дэманстравалі фрагмент «Масленіца гуляла — вясну сустракала».

— Мы гэтую праграму спецыяльна рабілі на беларускай мове, — прызналіся артысты. — Захоўваем нашы традыцыі і прасоўваем у масы. Фестываль для нас — добрая аддушына. Стасункі вельмі важныя. Хочацца, каб такіх сустрэч было болей. Яны даюць магчымасць падтрымаць знаёмствы, знайсці новыя.

Чатыры гады таму фестываль «Разам мы зможам больш!» праводзіўся ў Магілёве на міжнародным узроўні. Тады прыязджалі творчыя людзі з інваліднасцю з некалькіх абласцей Расійскай Федэрацыі. Гэтым разам было прыемна пачуць ад старшыні Рэспубліканскага савета па пытаннях клубнай дзейнасці і народнай творчасці пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, дырэктара Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы Алега Хмялькова, што на наступны год зноў плануецца зрабіць яго міжнародным. «Прынамсі, Пасткамітэт Саюзнай дзяржавы ўжо зацвердзіў яго», — удакладніў ён.

Сёлетні фестываль рэгіянальны, але не стаў ад гэтага менш цікавым і насычаным. Усе яго канкурсанты — і артысты, і майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці — атрымалі дыпломы: хто — пераможцаў, хто — прызёраў, хто — проста ўдзельнікаў. Нікога не пакрыўдзілі.

Асобныя віншаванні пераможцам

Дыпломамі I ступені абласнога фестывалю творчасці інвалідаў «Разам мы зможам больш!» узнагароджаны ўдзельнікі ад магілёўскага Дома культуры прадпрыемства «Метыз» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх» Уладзімір Ляпусцін (намінацыя «Выяўленчае мастацтва»), дуэт Наталлі Зайцавай і Рамана Харунжага ад народнага тэатра жэставаў песні «Рукі, якія спяваюць» («Жэставыя спевы»), а таксама ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці «Універсальная сямейка» («Арыгінальны жанр») і Маргарыта Марахоўка («Харэаграфічнае мастацтва») Дома культуры прадпрыемства «Універсал Бабруйск» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх».

У пераможцах — прадстаўнікі Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў» Любоў Пляскіна («Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва»), Алена Краснянкова («Аўтарская паэзія і бардаўская творчасць») і Святлана Перуноўская («Эстрадныя спевы»).

Найвышэйшую адзнаку атрымаў таксама народны хор народнай песні «Гасцінец» Магілёўскай гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» пад кіраўніцтвам Мікалая Варапая («Народныя спевы»).

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

Правілы бяспекі

САМАІЗАЛЯЦЫЯ: хто абавязаны выконваць рэжым і чым пагражае яго парушэнне?

З пачатку распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі слова «самаізаляцыя» трывала ўвайшло ў наш ужытак. З ліпеня гэтага года яе тэрмін скарочаны з 10 да сямі дзён як для беларусаў, так і для замежнікаў, якія прыехалі ў нашу краіну. Хто мусіць праходзіць самаізаляцыю? На што падчас дадзенага тэрміну дзейнічае строгая забарона і ці можна, напрыклад, наведаць аптэку і крамы? Аб правілах паводзін і абмежаваннях расказала ўрач-эпідэміёлаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Таццяна ЗАГОРСКАЯ.

— Таццяна Алегаўна, правілы і рэкамендацыі для хворых і кантактных асоб з пачатку пандэміі COVID-19 неаднойчы мяняліся. Давайце нагадаем чытачам, хто сёння мусіць выконваць самаізаляцыю.

— Каранавірусная інфекцыя ўсіх нас прымусіла перагледзець спосаб жыцця і запатрабавала асаблівых мер для выхаду са складаной сітуацыі, адной з якіх стала самаізаляцыя. Ёй падлягаюць асобы з устаноўленым дыягназам COVID-19, якія знаходзяцца на амбулаторным лячэнні, кантакты першага ўзроўню і людзі, якія прыбылі з краін з неспрыяльнай сітуацыяй па інфекцыі COVID-19 з адсутнасцю дакументальнага пацвярджэння пройдзенага курса вакцынацыі.

— Ці кантралюецца выкананне самаізаляцыі?

— З пачатку гэтага года выкананне патрабаванняў самаізаляцыі на тэрыторыі Мінскай вобласці, напрыклад, пракантралявана ў 79,6 % тых, хто захварэў на інфекцыю COVID-19 (яны знаходзіліся на амбулаторным лячэнні), з ліку кантактаў 1-га ўзроўню — 85,7 %, з ліку асоб, якія прыбылі з неспрыяльных па інфекцыі COVID-19 краін — 61,8 %.

Само слова «самаізаляцыя» мае на ўвазе факт самастойнага выканання рэжыму, мінімальных зносін са знешнім светам, аднак на тэрыторыі Мінскай вобласці ў адзінкавых выпадках зарэгістраваны парушэнні самаізаляцыі. Нягледзячы на тое, што правілы захавання самаізаляцыі парушальнікам былі загадзя растлумачаны, яны пакінулі месца знаходжання і адправіліся ў краму ці ў госці, наведваючы пры гэтым месцы масавага знаходжання людзей. За парушэнне дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь вінаватыя былі прыцягнутыя да адказнасці.

— Чаго нельга рабіць падчас самаізаляцыі?

— Неабходна разумець, што самаізаляцыя з'яўляецца вымушанай мерай і закліканая паменшыць рызыку заражэння здаровых грамадзян. Акрамя таго, гэта з'яўляецца мерай сацыяльнай адказнасці асоб, якія могуць быць пераносчыкамі захворванняў. Правілы паводзін пры такім рэжыме жыцця простыя і зразумелыя — максімальнае скарачэнне кантактаў са знешнім светам, гэта будзе найлепшым спосабам клопату аб навакольных. Але ўсё ж варта абазначыць некалькі важных правілаў: забараняецца наведваць месцы работы ці вучобы, аб'екты гандлю і грамадскага харчавання, спартыўныя, выставачныя і канцэртныя залы, кінатэатры, вакзалы і іншыя месцы масавага знаходжання людзей.

— А калі чалавек жыве адзін і мусіць самастойна набываць лекі і прадукты, ці можа ён выйсці ў аптэку ці краму?

— Вядома, для такіх выпадкаў прадугледжаны выключэнні — пры крайняй неабходнасці можна выйсці ў найбліжэйшую прадуктовую краму або аптэку, вынесці смецце, наведаць арганізацыю аховы здароўя для атрымання экстраннай ці неадкладнай медыцынскай дапамогі. У такім выпадку пры выхадзе з дому трэба выкарыстоўваць маску і не дапускаць кантактаў з іншымі людзьмі.

Заўсёды памятайце, што, парушаючы патрабаванні самаізаляцыі, вы падвяргаеце рызыцы заражэння навакольных. Усе любяць свае сем'і і кожны перажывае за сваё здароўе, ніхто не хоча хварэць. Таму ў неспрыяльны час пандэміі важна клапаціцца не толькі пра сябе, але і пра навакольных.

Алена КРАВЕЦ.

ЧЫРВОНЫ ПРАФЕСАР

У свой час мне давялося пазнаёміцца з загадчыцай кафедры замежных моў Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі, статыстыкі і інфарматыкі (МЭСІ) Ірынай Фёдараўнай Турук. Яна жыла на Спірыдонаўцы, дзівоснай вуліцы ў цэнтры Масквы, якая вядзе ад Малой Нікіцкай да былой Патрыяршай слабады, якую большасць масквічоў і гасцей сталіцы ведае па Патрыяршых сажалках. Гэта тут аднойчы гарачым летнім днём з'явілася дзіўная парачка, а потым трамвай адрэзаў галаву грамадзяніну Берліёзу... Ледзь ці не пад вокнамі кватэры Ірыны Фёдараўны знаходзіцца помнік Аляксандру Блоку. Нядоўгі час ён жыў у адным з асабнякоў псеўдагатычнага стылю, якімі забудавана Спірыдонаўка. А калі яшчэ ўспомніць, што ў царкве Вялікага Узнясення, якая стаіць непадалёк на Вялікай Нікіцкай, у 1831 годзе Пушкін браў шлюб з Наталляй Ганчаровай, то адпадаюць апошнія сумненні — гэтыя мясціны наскрозь прасякнуты літаратурай і рамантыкай.

— Можа, менавіта таму мой бацька, Фёдар Фёдаравіч Турук, — сказала мне Ірына Фёдараўна, — тады малады выкладчык старажытных моў і гісторыі ў гімназіі, ажаніўся з выпускніцай гэтай гімназіі Леначкай Пчаліной. Між іншым, дваранкай. Гэта быў раман стагоддзя! Яна выпусцілася з гімназіі ў тысяча дзевяцьсот васямнаццатым. І адразу выскачыла замуж. Гэта было ў традыцыях таго часу — насуперак саслоўным забабонам. Бацькі былі катэгарычна супраць. І гэта таксама ў традыцыях таго часу. Старое жыццё ні ў чым не хацела мірыцца з новым. Мама зацяжарала, вось-вось павінна была з'явіцца мая старэйшая сястра Зоя, а тату трэба ехаць у камандзіроўку ў Мінск.

— А што ў Мінску?

— Трэба было стварацьБеларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Тату туды адправілі разам з Пічэтам і Фрумкінай. Казаў, што вёз з сабой два чамаданы кніг, ледзь рукі не адарваў.

Пазней я даведаўся, што Фёдар Турук з гэтым адказным заданнем быў накіраваны ў Мінск зусім не выпадкова.

Яго ўніверсітэты

Фёдар Турук нарадзіўся 8 лютага 1889 года ў маленькай вёсачцы Балотца Шчорсаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні. З малых гадоў працаваў па гаспадарцы, пасвіў свіней і кароў. У чатырнаццаць гадоў стаў працаваць на нафме. Вызначала яго сярод аднагодкаў толькі адно — гарачае жаданне вучыцца. Прыродная кемлівасць дапамагла яму самастойна навучыцца чытаць і пісаць. У вёсцы заўважылі яго здольнасці, і старасta дапамог уладкаваць Фёдара ў царкоўнаприходскую школу ў Жыровіцах. Фёдар скончыў яе з адзнакай, што дало яму магчымасць працягнуць вучобу ў Віленскай духоўнай семінарыі.

Аднак Фёдар адчуваў, што рамкі семінарыі для яго цесныя. Яму цікавыя былі не толькі царкоўныя кнігі, але і ўсё, што адбываецца вакол. У 1911 годзе Фёдар Турук паступіў па конкурсе ў Пецярбургскі гісторыка-філалагічны інстытут, у якім займаўся вывучэннем класічных моў і антычнай культуры. Вось што ён пісаў пра гэты перыяд свайго жыцця: «Імкнучыся папоўніць і паглыбіць свае гістарычныя веды, я адначасова праслухаў поўны курс навук у Петраградскім археалагічным інстытуце, які скончыў у тым жа 1915 годзе са званнем правадзейнага члена інстытута».

Пасля заканчэння абодвух інстытутаў у 1915 годзе Фёдар Турук спачатку стаў працаваць выкладчыкам гімназіі ў Мінску, а затым у Маскве. Працуючы выкладчыкам, Турук ні на хвіліну не забываў пра сваю Радзіму. Ён стаў адным з ініцыятараў стварэння і абвяшчэння Беларускай народнай грамады (БНГ). Гэта адбылося 9 мая 1915 года на мітынгу ў Маскоўскім універсітэце. А ў маі 1917 года Фёдар Турук узначаліў БНГ. У яе праграму ўваходзілі нацыянальна-культурная аўтаномія Беларусі, увядзенне самакіравання і перадача зямлі беларускім нацыянальным Саветам.

У лістападзе 1917 года Фёдар Турук балаціраваўся ва Усерасійскі ўстаноўчы сход ад БНГ. З сакавіка 1918-га ён — супрацоўнік Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама).

25 снежня 1918 года ў доме на Паварской, 52, дзе пазней размясціўся Саюз пісьменнікаў СССР, адбылося пасяджэнне, на якое Сталін запрасіў дзеячаў беларускага руху, сярод якіх былі Іосіф Лагун, Дзмітрый Чарнушэвіч, Зміцер Жылуновіч, Фёдар Турук. Абмяркоўвалася пытанне аб абвяшчэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі. Сталін прапанаваў скласці спіс членаў Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі і маніфест. У спісе павінны былі быць і актыўныя работнікі маскоўскай секцыі. Але пры гэтым Сталін лічыў немэтазгодным зрываць іх з месцаў, калі тое пашкодзіць справе.

Гэтым разам Фёдар Турук застаўся ў Маскве. У 1919 годзе яго прызначылі загадчыкам беларускага аддзела асветы нацыянальных меншасцяў Наркамата асветы РСФСР, створанага на базе культурна-асветніцкага аддзела Белнацкама. У маі 1920 года ён падаў у Народны камісарыят па замежных справах РСФСР запіску «Савецкая ўлада ў Беларусі». Пазней на яе падставе ён напісаў кнігу «Беларускі рух».

Неўзабаве Сталін зноў запрасіў да сябе гісторыка У. І. Пічэту, партработніка М. Я. Фрумкіну і Ф. Ф. Турука. І пацікавіўся, як яны глядзяць на рашэнне партыі адкрыць у Мінску ўніверсітэт. — «Станоўча!» — адказаў за ўсіх Пічэта.

«Вось вас мы і прызначаем рэктарам гэтага ўніверсітэта, — усміхнуўся Сталін. — А дапамагаць вам будуць Турук і Фрумкіна. Адзін — выдатны выкладчык, другая — цудоўны арганізатар».

Як прадстаўнік рабочай камісіі па арганізацыі БДУ, у канцы 1920 года Турук разам з Пічэтам выехаў у Мінск. Ён стаў сакратаром згаданай камісіі, членам часовага праўлення БДУ. Разам з Пічэтам і Фрумкінай яны працавалі без выхадных. Падабралі памяшканне для ўніверсітэта, зацвердзілі колькасць факультэтаў, дамовіліся з найлепшымі выкладчыкамі, склалі вучэбныя планы. І ў кастрычніку 1921 года аўдыторыі ўніверсітэта запоўніліся першымі студэнтамі. Гэта былі ўчарашнія сяляне, рабочыя і салдаты, а таксама выхадцы з рабочай інтэлігенцыі.

У гэтым жа годзе Фёдар Турук стаў прафесарам БДУ на кафедры гісторыі Беларусі. У 1921—1922 гадах вёў практычныя заняткі па крытычным вывучэнні земскіх і шляхецкіх прывілеяў

на факультэце грамадскіх навук, потым працаваў на педагагічным факультэце БДУ.

Не страціла рыс нацыі

У 1921 годзе Фёдар Турук выдаў сваю галоўную навуковую працу: «Беларускі рух. Нарыс гісторыі нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху беларусаў».

Гаворачы аб каранях гэтага руху, Турук пісаў: «Беларускі рух, які з'яўляецца, па сутнасці, адраджэннем беларускага народа, мае глыбокія карані ў своеасаблівым мінулым Беларусі, у этнаграфічных і лінгвістычных асаблівасцях і эканамічных умовах жыцця беларусаў. Перажыўшы спачатку самастойна, а затым у аб'яднанні з Літвой у форме Вялікага княства Літоўска-Рускага (беларускага) перыяд найвышэйшага росквіту дзяржаўнасці і грамадскасці (XI—XIV стст.), нацыянальнай культуры (XIII—XVI стст.), пабудаваных на свабодных дэмакратычных пачатках, беларускі народ на працягу ўсяго свайго далейшага шматвяковага сумеснага жыцця з Польшчай (XVI—XVIII стст.) і Расіяй (XVIII—XX стст.) не мог прымірыцца з тым асноўным пачаткам цывілізацыі, які ўносілі ў Беларусь Польшча — у форме шляхецкай арыстакратычнай рэспублікі, Масква — баярскай алігархіі і манархічнага абсалютызму. У выніку нацыянальна-рэлігійных антаганізмаў і цэлага шэрага фактараў сацыяльнага характару, класавых і саслоўных супярэчнасцяў, якія дзейнічалі ў гісторыі Беларусі, беларускаму народу ў агульным ходзе гістарычных падзей не ўдалося адстаяць сваёй дзяржаўнай і грамадскай самастойнасці, захаваць свае найлепшыя жывыя творчыя нацыянальныя сілы. Беларуская народная маса, паступова страчваючы свае нацыянальныя «вярхі» — паменае дваранства, вышэйшае духавенства і гараджан — усіх тых, хто станавіўся ёй, дзякуючы свайму прывілеяванаму сацыяльнаму становішчу, чужы па мове, веры, па ўсім укладзе быту, пачуццяў і думак, не страціла, аднак, да гэтага часу рысаў нацыі, якія адрозніваюць яе ад іншых народнасцяў. Аддадзеная сама сабе ў сваіх самабытных прымітыўных формах жыцця, яна захавала да нашага часу і сваю родную мову, свае вераванні, звычаі, свой агульны культурны і эканамічны ўклад жыцця».

У сваім даследаванні Турук прасачыў усе этапы беларускага руху — ад паўстання палякаў супраць царскай Расіі 1831 года да польскай акупацыі беларускіх зямель у 1919—1920 гадах. Завяршыў ён сваю кнігу дадаткамі, сярод якіх праграма Беларускай сацыялістычнай грамады, універсал канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага 1915 года, статут Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый 1917 года, пастанова I Усебеларускага з'езда аб самавызначэнні Беларусі, тэлеграма старшыні Савета Камісараў Заходняй вобласці Ландэра з нагоды роспуску I Усебеларускага з'езда, статутныя граматы да народаў Беларусі Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, вітальная тэлеграма Мінскага ўрада германскаму імператару Вільгельму, маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі і іншыя ўнікальныя дакументы.

Пад нумарам адзін у «Дадатках» ён змясціў прадмову да зборніка «Дудка беларуская» Багушэвіча-Бурачка, які выйшаў у 1891 годзе ў Кракаве. Гэты дадатак, на думку Фёдара Турука, з'яўляецца кароткім пераказам светапогляду паэта-родапачынальніка сучаснай беларускай літаратуры, які адыграў вялікую ролю ў развіцці беларускага нацыянальнага руху. У ім, у прыватнасці, гаворыцца: *«Спакон веку, як наша зямелька з Літвой злучылася... усе яе «Беларуссю» звалі, і нездарма гэта! Не Вялікая, не Малая, не Чырвоная, не Чорная яна была, а Белая, чыстая... Можа, хто спытае: дзе ж цяпер Беларусь? Там, браткі, яна, дзе наша мова жыве: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска... да Чарнігава, дзе Гродна, Мінск, Магілёў, Віцебск, Вільня і мноства мястэчак і вёсак»*.

«Знойдзецца і пакой, і шклянка чаю...»

Глыбока разумеючы гісторыю беларускага руху, Фёдар Турук не мог прайсці міма творчасці іншага выдатнага паэта — Янкі Купалы. Пазнаёміўшыся з ім студэнтам у Пецярбургу, ён ужо не выпускаў Янку Купалу са свайго поля зроку.

У Ірыны Фёдараўны Турук захаваліся чатыры лісты Янкі Купалы, адрасаваныя бацьку.

— Верагодна, лістоў было больш, — сказала яна, — але пасля рэпрэсій канца дваццатых — пачатку трыццатых гадоў бацька частку свайго архіва знішчыў. Аднак я ведаю, што ён перакладаў работы Янкі Купалы і спрыяў выданню зборніка яго вершаў на рускай мове ў Маскве.

Першы з лістоў Янкі Купалы Фёдару Туруку быў напісана 20 ліпеня 1919 года.

«Глубокоуважаемый и дорогой Фёдор Фёдорович!

Покорнейшая к Вам просьба: не откажите по использовании клише с моей фотогр<афии> отступить его мне, конечно, если это клише Вам не нужно будет. Буду весьма Вам благодарен за эту любезность.

Если будут какие расходы, то я охотно их покрою. Что слышно у Вас? Поддерживайте как-нибудь свой Белорусский подотдел. Я сегодня узнал — литерат<урно>-издат<ельский> подотдел при Наркомпросе Литбел ликвидируется. Таким чином, остаётся только Ваш подотдел, который один только сможет что-нибудь издавать. Теперь такое дело: мне передавали, что теперешний зав<едующий> лит<ературно>-изд<ательским> отделом Наркомпроса Литбел тов. Леущенко предполагает ехать в качестве инструктора от своего отдела в Киев и там организовать печатание белорусских книг. Так вот, может быть, Вы списались с ним и устроили бы тоже печатание своих изданий в Киеве. Что Вы на это?

Адрес Леущенко: Бобруйск, Народный комиссариат просвещения Литвы и Белоруссии.

В Минске у нас довольно спокойно. Поляков немного отогнали. Возможно, что Минска так и не удастся им повидать.

Будьте здоровы и веселы. Если надумаетесь, Фёдор Фёдорович, побывать в Минске, то не забывайте про нас. Милости просим. Найдётся для Вас и комната, и стакан чаю с хлебом и с патокой.

Привет знакомым и друзьям.

Искренне преданный Вам Ив. Луцевич».

А гэта апошні з захаваных лістоў, адпраўлены ў 1920 г.

«Глубокоуважаемый Фёдор Фёдорович!

В прошлом году, будучи в Москве, я оставил Вам рукопись своих стихов «Спадчына» и получил в счёт гонорара аванс. До сего времени, как мне передавали, книга эта Белорусским подотделом не издана. Так вот, не посоветуете ли, дорогой Фёдор Фёдорович, как бы ускорить печатание этого сборника. Нельзя ли сделать так: если представится возможность, издать сборник здесь в Минске на средства Лит<ературно>-издат<ельского> отдела Наркомпроса Белоруссии с условием, что с авторского гонорара будет возвращён Белорусскому подотделу в Москве полученный мною аванс. Как Вы на это смотрите? Был бы Вам очень признателен, если бы Вы по возможности в скором времени сообщили мне свои соображения. Без Вашего согласия на это, конечно, издать книги я не смогу. А может быть, Вы зачислите полученный мною аванс на какую-нибудь другую мою книгу, напр. на издание моего сборника «Huslar» русским шрифтом, вышедшего только латинкой и к тому уже разошедшегося.

Одним словом, глубокоуважаемый Фёдор Фёдорович, подумайте и дайте ответ, как эту всю историю оформить, чтобы и волк был сыт и козы целы.

Я слышал, что Вы собираетесь приехать в Минск. Дело очень хорошее. Работы культурной тут много, а работников мало.

Искренне преданный Вам Ив. Луцевич.

Адрес мой: Минск, Захарьевская, 137, Ивану Доминиковичу Луцевичу».

Мы ведаем, што ў 1919 годзе ў Маскве выйшла кніга Янкі Купалы «Выбраныя вершы». А ў 1922-м у Мінску выходзіць зборнік яго вершаў «Спадчына». Такім чынам, Фёдар Турук прыслухаўся да просьбы паэта выдаць кнігу ў Мінску на сродкі літаратурна-выдавецкага аддзела Наркамасветы Беларусі.

У 1923 годзе Фёдар Турук вярнуўся з Мінска ў Маскву і стаў, як тады казалі, чырвоным прафесарам, выкладаючы ў Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцяў Захаду. Пазней ён працаваў у розных ВНУ краіны, апошняе месца работы — Маскоўскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, дзе ён узначальваў кафедру ўсеагульнай гісторыі.

* * *

Памёр Фёдар Турук 20 ліпеня 1960 года.

Імя Фёдара Фёдаравіча Турука апошнія гады ў Беларусі гучала нячаста, аднак гэта зусім не прыменшае яго заслуг перад Радзімай. Адзін з заснавальнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, ён назаўжды ўпісаў яго ў гісторыю маладой краіны.

Алесь КАЖАДУБ.

ТАМ, ДЗЕ ТАНЦАВАЛІ ДЗВЕ ТЭАФІЛІ. ЗАВУШША

Падарожжа ў Завушша пачалося для нас з вадзянога млына

Закінуты млын каля дарогі... Відаць, не так даўно яшчэ працаваў — унутры захаваўся рыштунак, ляжыць разбіты жорнаў... А вось і рэшткі вадзянога кола. Але там, дзе калісь бруіла вада, сёння зарослая балацявіна.

Цікава, ці кідалі некалі пад гэтае кола, па звычаі, кумпяк альбо кавалак сала, каб вадзянік не злізваў змазку з дэталяў млына? Ці выпіваў млынар у дзень святога Марціна, апякуна млынароў, чарку, стоячы на каменных жорнах?

Гарышча драўлянае, пасля — цэгла, унізе — каменны мур... Будаваны той млын, па некаторых звестках, у 1875 годзе, але, хутчэй, гэта год перабудавання... А круціліся ягоныя жорны яшчэ тады, калі ўладарыў тут сам Пане Каханку, найбольш легендарны з Радзівілаў... Тут жа непадалёк — Нясвіж, ягоная бліскучая рэзідэнцыя.

Вясельны падарунак

А Завушша Пане Каханку падарыў у якасці вясельнага падарунка сваёй сястры Тэафілііі.

Няпростае было тое вяселле... Скандал на ўсю Рэч Паспалітую.

Пакахала сястра самага магутнага магната дзяржавы простага шляхціца Ігнацыя Фелікса Мараўскага, які адважна біўся пад Слонімам у войску Пане Каханку, супраць войскаў караля і ягоных саюзнікаў. І панна Тэафіля там жа была, з шабляй у руках.

Закаханым давялося ўцячы ў Львоў, таемна абвянчацца, спасылаючыся на цяжарнасць нявесты, каб здабыць неахвотны дазвол брата на такі мезальянс. Завушша ў падарунак — гэта быў своеасаблівы жэст прымірэння...

Было ў сядзібе тры брамы, адна — парадная, другая — гаспадарчая, трэцяя вяла ў парк. Сёння нас сустракаюць трава ды кустоўе.

Мы прабіраемся па ледзь пратаптанай сцежцы да каменнага будынка з калонамі... Джыгае крапіва...

Але гэта не сядзібны дом. Яго проста не засталося. Хоць Ігнат і Тэафілія пабудавалі незвычайныя апартаменты — дом і два флігелі-афіцыны з лістоўніцы. Двухпавярховы дом называўся «чырвоным», меў порцік з чатырма калонамі тасканскага ордэра. Нядзіўна, чаму пані Тэафіля Мараўская выбрала адсылку да Старажытнага Рыма, дзе прыдумалі гэты ордэр, — яна ж была жанчынай адукаванай, з дзяцінства іграла ў спектаклях сваёй маці, Уршулі Радзівіл, якая выкарыстоўвала антычныя сюжэты. Услед за братам, у якога канфіскавалі маёнткі, адправілася ў Еўропу, падарожнічала па Італіі, пакінула пра тое цікавыя мемуары. Пасля вяртання на Радзіму, прымірэння Пане Каханку з каралём пасяліліся Мараўскія ў Завушшы, так што італьянскія ўражанні былі свежыя...

Намаляваныя калоны і папяровы абраз

Мы аглядаем зарослыя хмызам краявіды... Да Італіі не надта падобна. Дзесьці тут стаяў дом, у якім Тэафіля таксама ладзіла спектаклі. А падчас Першай сусветнай тут зладзілі кінатэатр для нямецкіх жаўнераў, для чаго разабралі ўнутраныя сцены... Цяпер жа і следу ад дома не знайшлі.

Шлюб Мараўскіх, насуперак зласлівым прадказанням, аказаўся шчаслівы, Мараўскі з дапамогай усемагутнага свайго стаў генерал-маёрам.

Калісьці тут былі ліпавыя прысады, якія вялі да берага Ушы (Завушша ж таму, што калі ехаць ад Нясвіжа, сядзіба гэтая — «за Ушой). Раслі кусты бэзу, стаялі альтанкі, дзе можна было піць модную каву...

А мы ўжо каля ацалелага каменнага будынка — капліцы. Таксама ў антычным стылі... Калоны дарычнага ордэра. Унізе, зарослы травою, уваход у крыпту, зразумела, даўно пустую. Унутры капліцы засталіся рэшткі роспісу. Калісьці, каб аздобіць алтарную сцяну, яе распісалі так, што здавалася, там ёсць калоны і ляпніна. Сёння ад былой раскошы засталіся фрагменты роспісу і папяровы абраз Маці Божай...

Круглыя калоны ўнутры капліцы аблезлі, з-пад белай тынкоўкі паказваецца кроў цэглы... Дарэчы, побач з капліцаю ляжыць куча свежай цэглы — магчыма, рэстаўрацыя ўсё-ткі адбудзецца?

Каралеўскае гасцяванне

Цікава, што тут, у Завушшы, двойчы бываў Станіслаў Панятоўскі. Гасцяваў у «рыцарскай дзяўчыны», якая білася супраць ягоных войскаў. Палітыка — яна ж такая, магнатам не прывыкаць было па некалькі разоў на тыдні партыі мяняць. Панятоўскі ж у Нясвіж ездзіў, каб у Пане Каханку грошай прасіць... Гэты момант апісаў у рамане «Кароль у Нясвіжы» Юзаф Крашэўскі, ёсць сярод герояў і Ігнацый Мараўскі: *«Даволі прыемны, рыцарскай паставы, не вельмі ўжо малады, але здаровы, з румянкам мужчына. Прыгожым яго назваць было нельга, бо рысы твару, даволі звычайныя, не моцна выяўленыя, нічым асабліва не вылучаліся, але энергія, упэўненасць у сабе, жаўнерская фанабэрыя на ім былі дакладна напісаныя»*.

Менавіта з ім Пане Каханку і абмяркоўвае, як прыняць «каралеэканомшчыка» і якія «фінфы» яму падпусціць. Ды наракае на сястрыцу:

«— Усё гэта бабскія інтрыгі... Тваёй жонцы захацелася паказаць каралю Завушша, значыць, я яго павінен прывесці ў Нясвіж для яе, каб яна яму кветачкамі хвалілася».

З працытаванага ўрыўка вынікае, што ў сядзібе было шмат кветак, цудоўныя клумбы...

Ідзём пра высокай траве да яшчэ аднаго захаванага будынка — свірна. Драўляны, шэры... А калісьці Тэафіля, дачка Уршулі, стварыла ў Завушшы сапраўдны прытулак муз. Была тут і неблагая калекцыя карцін, сярод якіх партрэт генерала Ігнацыя Мараўскага пэндзля Марчэла Бачарэлі, партрэт Тэафілі Мараўскай аўтарства знакамітага польскага мастака Юзафа Пешкі, партрэт пляменніка Пане Каханку Дамініка Радзівіла ад беларускага мастака Юзафа Аляшкевіча...

У рамане Крашэўскага Тэафіля Мараўская апісана так: *«...высокага росту, дастаткова мажная, не надта ўжо маладая, зусім непрыгожая, з мужчынскім выразам твару і чарнеючай расліннасцю над верхняй губой, дама ў белай сукенцы, з залатой табакеркай у руках»*.

Што ж, Тэафіля з Радзівілаў да канца жыцця была надзвычай актыўнай дамай, нават была ў жаночай, «адапцыйнай», ложы «Ідэальная вернасць» у Вільні. Дарэчы, пасля смерці Ігнацыя яшчэ тройчы выходзіла замуж.

Скандальныя шлюбы працягваюцца

Непакорлівы характар Тэафіля-старэйшая, гледзячы па ўсім, перадала ў спадчыну.

Яе спадчынніца Тэафіля, выйшла ў пятнаццаць гадоў замуж за нейкага Юзафа Старжэнскага.

Неяк гасцявала яна ў Нясвіжы... І пазнаёмілася са сваяком, Дамінікам Радзівілам. Таксама, дарэчы, жанатым. Менавіта Дамініку, сыну свайго зводнага брата, Караль Радзівіл адпісаў сваю маёмасць. Паміж стрыечнікамі ўспыхнула каханне.

Дамінік таксама ўспадчыніў палкую натуру: ягоны бацька, зусім юны, гэтак жа закахаўся ў прынцэсу Турн-і-Таксіс і ажаніўся... А потым тая Турн-і-Таксіс закахалася ў чэшскага музыку Душэка, які быў запрошаны ў Нясвіж, і збегла з ім...

Вось і Дамінік і Тэафіля ўпёрліся, вырашыўшы ажаніцца.

Успомніўся кавалачак гістарычнай аповесці Кастуся Тарасава «Аўдытарская праверка ў Нясвіжы, альбо Скарб Нясвіжскага замка», дзеянне якой адбываецца пасля вайны з Напалеонам. Герой аповесці шукае скарбы, вывезеныя падчас ваенных падзей з нясвіжскага замка. І вось які там гучыць дыялог:

«— А князь Дамінік Радзівіл быў на пераправе?

— Таксама перайшоў на той бок з французскай гвардыяй.

— Тыдні за два да Беразіны, — сказаў я, — з нясвіжскага замка Малдаўская армія забрала ягоныя скарбы. Аб гэтым не было там размоваў?

— Хто мог думаць пра скарбы ў той мясарубцы, — пасміхнуўся Сабковіч. — Там за кавалак хлеба давалі брыльянт. Ды і чаго на вайне каштаваў Радзівіл? Сотні такіх былі ў Напалеона. У якасці ўланскага камандзіра нічым ён не вызначыўся. Ды і да вайны толькі тым уславіў сябе, што аддаў за развод з першай жонкай два з паловай мільёны.

— Колькі? — перапытаў я.

Ён паўтарыў лічбу, суправаджаючы яе тлумачэннем:

— Другой яго жонкай была кузіна — Тэафіля Мараўская з Завушша. Ёй таксама давялося скасоўваць шлюб з першым мужам. Завушша недалёка ад нашай сядзібы... Я гэтую Тэфку дзясяткі разоў бачыў у нашым парафіяльным Ішкальдскім касцёле на святы...

Нейкі час мы ехалі моўчкі, бо я вылічваў, колькі гадоў трэба мне паслужыць, каб сабраць два з паловай мільёны. Вынікала, што, калі не аднаўляць мундзір, то патрэбная сума набярэцца за тры стагоддзі.

— Цікава, — спытаў я свайго спадарожніка, — а як князь расплочваўся за развод — залатымі ці асігнацыямі?

— Не ведаю, — усміхнуўся Сабковіч, — думаю, залатымі».

Вось так Тэафілія Мараўская стала жонкай свайго стрыечнага брата...

Праўда, на гэты конт існавала яшчэ адна версія — быццам Дамінік Радзівіл выйграў яе ў карты ў ейнага мужа, Старжэнскага, паставіўшы супраць дваццаць тысяч залатых.

Цені на дне лядоўні

У свірне, наколькі можна бачыць праз шчыліны, пуста... Але, прынамсі, вісіць шыльдачка, што гэта гісторыка-культурная каштоўнасць, якая ахоўваецца дзяржавай. Добра і тое, што на дзвярах свірна, які ў васямнаццатым стагоддзі ўжо тут стаяў, замок, і вокны пазабіваныя... Нам, вядома, хацелася б зайсці — але лепш, калі не залезуць нейкія нядобрыя людзі, не спаляць выпадкова, не засмецяць...

Мы ідзём да наступнага аб'екта, які захаваўся... А менавіта — лядоўні.

Праўда, застаўся ад яе толькі падмурак, прастакутнік, выкладзены з магутных камянёў... Затое шыльдачка пра гісторыка-культурную каштоўнасць маецца.

Што ж, тут было што захоўваць. У Завушшы меліся і аранжарэя, і сады, і студня з помпай...

Тэафіля-малодшая нарадзіла ад Дамініка дваіх дзяцей... Аляксандр лічыўся бастардам — не паспелі бацькі ў час ажаніцца, Стафанія, якая ўрэшце засталася спадчынніцай роду, рана памерла. Пакінуўшы вялізныя ўладанні свайму мужу, Вітгенштэйну...

Апошняя ўладальніца Завушша з роду Радзівілаў Стафанія засталася ў гісторыі рамантычнай, сціплай прыгажуняй — менавіта так апісвае яе ў мемуарах сяброўка, фрэйліна Смірнова-Расэт. А вось яе маці пры дварэ расійскага імператара Аляксандра I называлі «вечна нечай каханкай» і «княгіняй мноства мужоў» (Дамінік памёр ад ран у 1813-м). Калі яна разводзілася з графам Чарнышовым, расслумачыла імператару прычыну — муж забівае яе нудою. Памерла Тэафіля Мараўская ад сухотаў, перад смерцю яе абабраў малады каханак, так што выпрошвала грошы ў дачкі Стафаніі.

Дарэчы, імператар Аляксандр I у 1818-м гасцяваў у Завушшы ў Тэафілі Мараўскай.

Зазіраем у рэшткі лядоўні... Кажуць, тут яшчэ нядаўна быў драўляны дах. Сёння нам з засмечанага дна пагрозліва ківае высозны палын.

Цені мінулага... Можна разгледзець іх і паміж аблезлых калон, і ў каменных правалах, уяўленне дазволіць пачуць плёскат хваль у коле вадзянога млына...

У 1918-м Завушша разрабавалі жаўнеры, якія беглі з фронту. Зніклі мэбля ў стылі ракако, срэбныя прыборы, бронзавыя падсвечнікі... Некалькі карцін трапіла ў музей Ельскага ў Замосці. У 1940-м тут быў арганізаваны калгас «Чырвоны бераг». Перад гэтым сядзіба належала Гартынгам.

Як турыстычны аб'ект Завушша вельмі зручнае — Нясвіж непадалёк, гісторыя багатая... Застаецца спадзявацца, што турыстаў сюды стане прыязджаць столькі, колькі цяпер расце хмызоў...

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Народныя традыцыі

Нацыянальныя строі, «Батлейка» і калядныя «Цары»

Як работнік культуры з Клецка адраджае спадчыну малой радзімы

Метадыст па народнай творчасці Клецкага раённага цэнтра культуры Вольга ПІЛЕЦКАЯ — чалавек творчы, апантаны. Займаецца вышыванкай, маляванымі дываномі. Акрамя таго, дзякуючы яе ініцыятыве і намаганням удалося знайсці і аднавіць многія народныя строі Слуцка-Капыльскага рэгіёна, а таксама старадаўнія абрады, традыцыі роднага краю.

Вольга Аляксандраўна пастаянна ездзіць у экспедыцыі па вёсках раёна, гутарыць з жыхарамі, якія знаёмяць яе з асаблівасцямі народнага касцюма. Месяцамі з задавальненнем дзеляцца фотаздымкамі строяў, рэчамі, што належалі іх бабулям і прабабулям.

Гарсэцік рабіўся на завязках. Гэта дазваляла карэкціраваць адзенне на фігуры, калі жанчына папраўлялася або худзела.

— Людзі часам мяркуюць так: падумаеш, пахавальныя фота, што ў іх цікавага, каму яны патрэбныя. Аказваецца, на іх можна ўбачыць традыцыі канкрэтнай мясцовасці: як афармлялі труну, як аздабляліся кветкамі ручной работы, жывым аспарагусам (папаратнікам). У розных вёсках яго называюць па-рознаму, — распавяла Вольга Аляксандраўна. — Напрыклад, апошняя экспедыцыя была зладжана сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук. Ездзілі канкрэтна па маіх матэрыялах і запісвалі на добрую апаратуру спевы бабуль, тое, як яны выцягваюць гукі, рабілі відэа, каб потым прафесіяналы змаглі паўтарыць гэты гук і манеру выканання. У адной з паездак нас напаткала вялікая ўдача — наткнуліся на рэдкі самабытны народны касцюм. Калісьці Ірына Шыліна, якая больш за трыццаць гадоў прапрацавала ў культуры, збірала даўнейшыя строі. Але з цягам часу ад гэтага адышлі, пачалі больш схіляцца да «папсы», эстрады. І традыцыі, і касцюмы былі закінутыя. А вось Ірына Цімафееўна столькі гадоў захоўвала нацыянальны касцюм, уласцівы для нашага рэгіёна. Убор, што насілі ў вёсцы Наваселле, належаў жанчыне 1901 года нараджэння, бытаваў ён прыкладна ў 30-я гады мінулага стагоддзя. А перадала яго Ірыне Цімафееўне яе сваячка Марыя Васілеўна Каражан — жыхарка Заастравечча.

Касцюм адметны асаблівасцямі ткацтва, вышыўкай у сінім колеры, каўняром, які завязваўся, іншымі тонкасцямі. І добры рэканструктар можа яго аднавіць. Такі ўбор вельмі далікатны. Дасведчаныя людзі, народныя ткачыхі кансультуюць Вольгу Пілецкую наконт таго, якія сродкі можна выкарыстаць, каб яго вымыць. Дапамагае спецыяліст па тэкстылі, касцюмер Галіна Дзмітрыеўна Яраш. Гэты строй, дарэчы, нельга разгладжваць электрычным прасам. Для гэтых мэт Вольга Пілецкая і Галіна Яраш знайшлі спецыяльныя прыстасаванні, якімі карысталіся нашы бабулі — пранік (драўляны брусок з рабрыстай паверхняй і ручкай) і качалку (на яе накручвалася бялізна). Але прывесці каштоўную рэч у належны выгляд — паўсправы, для яе захавання таксама неабходна стварыць аптымальныя ўмовы.

Важным дапаўненнем да народнага жаночага касцюма былі пацеркі. Лічылася, чым іх больш, тым багацейшая жанчына.

Вользе Аляксандраўне і Галіне Дзмітрыеўне ўдалося аднавіць касцюм трыццатых гадоў з шоўку. Ён паўсюль быў аздоблены каляровымі палоскамі ў люстраным выглядзе, з асобна выдзеленай цэнтральнай. Іх абавязкова павінна быць няцотная колькасць.

Майстрам давялося шмат папрацаваць для таго, каб касцюм не адрозніваўся ад арыгінала. Напрыклад, на выраб аўтэнтычнай спадніцы спатрэбілася больш як тры метры тканіны. Акрамя таго, неабходна было знайсці падыходзячыя карункі, тканіну, каб аздобіць падол. Але, бадай, самым складаным было зрабіць складкі на спадніцы-зборцы, адлегласць паміж якімі тры сантыметры.

— Што мы толькі ні рабілі, але складкі развальваліся. Сакрэтам падзялілася адна са старажылак. Аказваецца, каб змайстраваць такія зборкі, прымянялася тэхналогія маршчэння. Марачанкі (жыхаркі вёскі Морач) змочвалі тканіну растворам з вады і воцату, рабілі складкі, а затым іх прасавалі. Для гэтага бохан гарачага, толькі што з печкі, хлеба прыкладвалі, нібы прэс, каб складкі не разыходзіліся. Такі працэс займаў некалькі тыдняў, — кажа Вольга Пілецкая. — Кожная дэталь у народных касцюмах была карпатліва прадуманая. Напрыклад, гарсэцік рабіўся на завязках. Гэта дазваляла карэкціраваць адзенне на фігуры, калі жанчына папраўлялася або худзела.

Цікавасць мае і адноўлены вясельны строй 1930-х гадоў мінулага стагоддзя — шлюбная сукенка і мужчынскі касцюм. У дадзенай справе дапамаглі жыхары раёна. Яны дасылалі фотаздымкі сваіх бабуль і дзядуляў, якія пабраліся шлюбам. Ды і Вольга Пілецкая ездзіла па населеных пунктах, цікавілася ў жыхароў ці не засталіся ў іх вясельныя фатаграфіі продкаў. У выніку было сабрана дваццаць унікальных здымкаў. Вольга Пілецкая і касцюмер Галіна Яраш спыніліся на здымку сужэнцаў з вёскі Янавічы Алены і Сцяпана Вялічкавічаў, які пажаніліся 2 кастрычніка 1937 года. Клецкія майстрыхі да дробязяў паўтарылі ўсе дэталі вясельнай сукенкі. На гэта пайшло тры метры шоўку, ды яшчэ столькі ж на вэлюм. Давялося шмат папрацаваць над аздабленнем. Раней сукенку вымочвалі ў жэлацінавым або крухмальным растворы, затым самаробным прыстасаваннем, падобным на сучасны паяльнік з шарыкам на канцы, наносілі адбіткі кветак. У модзе 1930-х гадоў былі вясельныя букеты са штучных пёнаў. Бутаньерка для жаніха — абавязкова з галінак аспарагуса, які лічыўся сімвалам шчасця. А ў мужчынскія пінжакі ўстаўляліся падкладкі з конскага воласу, каб трымалі форму. Такія рарытэтныя экзэмпляры — пінжак, а таксама штаны, — знайшліся на гарышчы адной з жыхарак Клецка.

Важным дапаўненнем да народнага жаночага касцюма былі пацеркі. Лічылася, чым іх больш, тым багацейшая жанчына. Асаблівую ўвагу жанчыны ўдзялялі галаўному ўбору, які шмат гаварыў аб іх статусе. Напрыклад, дзяўчына на выданні заплятала валасы ў «кошык», галаву ўпрыгожвала пацеркамі, шырокімі ружовымі або чырвонымі стужкамі. Усе ведалі, што да яе можна было ісці сватацца.

Пасля вяселля старэйшыя жанчыны здымалі вэлюм з маладой і на тканіну запляталі валасы. Затым скручвалі з пакулля своеасаблівы «абаранак» на галаву, абгортвалі яго льняной тканінай і накрывалі шапачкай, на якую накідвалі хустку. Каб паўтарыць такую канструкцыю, давялося шмат папрацаваць — не ўсё адразу атрымлівалася.

— Каштоўная спадчына ў сем'ях перадаецца з пакалення ў пакаленне, беражліва захоўваецца ў куфрах. Старэйшыя жанчыны цяпер карыстаюцца даўнейшымі ўборамі. І калі прыязджаеш да іх дадому, то яны абавязкова дастаюць свае строі, прыбіраюцца, перш чым пачаць гутарку, — адзначае Вольга Пілецкая. — У самабытных строях марачанкі хадзілі літаральна да 1970-х гадоў. Яны не прызнавалі гарадскога адзення.

Метадыст часта ўдзельнічае ў розных фестывалях, выстаўках, брала ўдзел са сваёй калекцыяй у «Славянскім базары». У людзей звузілася паняцце народнага касцюма, лічыць яна. А гэта шырокае поле і ўяўленне. У Морачы — адно, у Кухчыцах або Галавачах — іншае. На кожнае мерапрыемства Вольга Аляксандраўна надзявае народны касцюм свайго рэгіёна, каб пазнаёміць наведвальнікаў з яго асаблівасцямі, адрозненнямі.

Акрамя народных строяў, Вольгу Пілецкую цікавяць і старажытныя абрады, уласцівыя для Клецкага рэгіёна. У стадыі рэалізацыі — праект «Сядзіба ў Садовай». Старшыня райвыканкама падтрымаў ідэю праекта, дапамог выдзеліць у гэтай вёсцы пустую хату, як іх называюць, хатку-адказніцу. У планах — наладзіць «Батлейку», якая бытавала менавіта ў Клецку. Лялечны тэатр збіраюцца рэканструяваць і паказваць на ім абрад «Цары» дзецям. Гэты абрад аднавілі ў Семежаве, ён унесены ў спіс нематэрыяльнай спадчыны. Але, аказваецца, у Клецку існавалі свае «Цары». Абрад адрозніваецца ад семежаўскага сваімі асаблівасцямі. Ёсць людзі, якія помняць яго, апісваюць у падрабязнасцях.

Майстрам давялося шмат папрацаваць для таго, каб касцюм не адрозніваўся ад арыгінала. Напрыклад, на выраб аўтэнтычнай спадніцы спатрэбілася больш як тры метры тканіны.

Работнікі культуры аднавілі таксама калядны абрад «Шчадрэц». Дэталі сталі вядомыя ад старажылаў раёна, дырэктара Лазовіцкага сельскага Дома культуры Сяргея Машко, які даўно вывучае традыцыі Клецкага краю. Менавіта ён расказаў, якія песні пелі ўдзельнікі падчас свята, што насілі з сабой.

Галоўным атрыбутам з'яўлялася васьміканцовая Віфлеемская зорка, з якой заходзілі ў хату. Яна рабілася з пруткоў і сіта і абклеівалася паперай. У цэнтр змяшчалі іконку і свечку, якія павінны былі асвятляць шлях людзям. Удзельнікі шэсця пераапраналіся ў жарабца (каня). Лічылася, што калі апошні пабывае ў доме, то год будзе шчаслівы і багаты для сям'і. Падчас свята гучалі завітальныя песні, частушкі.

Дадам, што Вольга Пілецкая адмыслова валодае майстэрствам выцінанкі, удзельнічала ў 13-м міжнародным сімпозіуме па мастацтве выцінанкі ў Маскоўскай вобласці. Яе матэрыялы былі надрукаваныя ў калектыўным зборніку. Акрамя таго, Вольга Аляксандраўна займаецца дывановымі маляванкамі, якіх у асобным пакоі раённага цэнтра культуры сабраны дзясяткі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3**

Предмет аукциона (одним лотом)
Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Техническая 1-я, д. 38

Наименование/Назначение	Инвентарный номер	Общ. пл. кв. м	Адрес (№ дома)
Склад (здание нежилое)	350/С-201331	406	38
Составные части и принадлежности: подвал, вход в подвал, пристройка, крыльцо			
Склад кирпичный (здание нежилое)	350/С-201330	124,1	38
Мехмастерская, гараж (здание нежилое)	350/С-201329	308	38
Тарный цех (здание нежилое)	350/С-201328	134,4	38
Здание сургучного цеха – контора (здание неустановленного назначения)	350/С-99284	1070,7	38
Составные части и принадлежности: пять пристроек			
Здание будки контрольной (здание нежилое)	350/С-197487	52,9	38/9
Составные части и принадлежности: две беседки			
Здание скважины (здание нежилое)	350/С-166125	17,8	38/2
Составные части и принадлежности: забор, ворота			

В состав лота входит оборудование: кран-балка (инв. № 5226), тельфер грузоподъемностью 3,2 т (инв. № 237), котел водогрейный КВ-80 (инв. № 6057), цистерны 10 т – 4 шт. (инв. №№ 2421, 2422, 2494, 2495), цистерна 4,5 т (инв. № 496)

Сведения о земельном участке: пл. **2,4429** га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования

Начальная цена лота с НДС 20 % – 579 367,07 бел. руб.

